ПРАДПРЫЕМСТВА З СУСВЕТНЫМ ІМЕМ 8–9

МАСТАЦТВА ПРАФЕСІЙНАГА ВІЗАЖУ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 ВЕРАСНЯ 2019 г. СУБОТА № 180 (29047)

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:

«Беларусь як транзітная дзяржава з адной з самых рэнтабельных і зручных у Еўропе лагістыкай лепш за ўсё відаць менавіта праз прызму мытных органаў. Таму няўхільны і штогадовы рост паказчыкаў транзіту — самая лепшая ацэнка работы мытнага ведамства. Увоз транзітных тавараў за 8 месяцаў 2019 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2018-га вырас на 7,9 % і склаў 11,4 мільёна тон. За студзень—жнівень 2019 года назіраецца чарговы рост грузавых транспартных сродкаў, якія прайшлі праз мытную граніцу. Колькасць тавараў, афармленых нашымі мытнікамі, таксама з году ў год павялічваецца — за 8 месяцаў гэтага года праз граніцу перамешчана на 733 тысячы тон тавараў больш, чым за аналагічны перыяд летась».

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ «БЕЛАРУСКАГА ЗОЛАТА»

Чаму лён — культура палітычнай значнасці

Пра тое, што Прэзідэнт збіраецца наведаць Карэлічы, стала вядома яшчэ ў канцы жніўня. Загадзя была анансавана і тэма візіту — наведванне льнозавода, размова пра першасную перапрацоўку гэтай культуры, ураджайнасць якой у рэгіёне вышэйшая за леташнюю амаль у два разы. Па словах кіраўніка краіны, лён для беларусаў — культура палітычнай значнасці. Яго сінія кветкі намаляваны на гербе нашай дзяржавы. Страта традыцый льнаводства была б для беларусаў недапушчальнай памылкай.

Дарэчы, рабочая паездка, якую Прэзідэнт даручыў запланаваць праз тыдзень пасля візіту ў Іўе, што адбыўся 21 жніўня, затрымалася. А магчыма, камандзіроўка ў Гродзенскую вобласць спецыяльна была прызначана на 20 верасня, калі адзначаецца 75-годдзе рэгіёна.

Фота БелТА.

Тактыка і тэхналогія

На ўгоддзях камунальнага ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Чарняхоўскі-Агра» Аляксандру Лукашэнку далажылі пра ход уборачнай кампаніі ў краіне, Гродзенскай вобласці і Карэліцкім раёне.

Міністр сельскай гаспадаркі Анатоль Хацько расказаў, як ідзе сяўба азімых культур і ўборка. Завяршыць сяўбу трэба да пачатку кастрычніка. СТАР. 2

Жыллё маё

КОД ПАДБЯРЫ НА РАЗ-ДВА-ТРЫ

Чаму дамафонныя сістэмы не ўтрымліваюць дзверы зачыненымі

Прынесці ў дом рэкламныя буклеты, зрабіць сюрпрыз, нечакана прыйшоўшы да сябра не ў пад'езд, а проста да кватэры, зайсці крыху пагрэцца зімою ці схавацца за дзвярыма ад незнаёмца, які ідзе за вамі следам... Зрабіць усё гэта можна, калі ведаеш коды ад розных дамафонных сістэм на дзвярах дамоў, нават не маючы ключа. З гэтай нагоды ў сеціве існуюць цэлыя форумы і шпаргалкі, як не проста ўвайсці без ключа ў пад'езд, мінуючы замкі, але і нават змяніць код або зрабіць так, нібыта дамафон працуе, а на справе — пацягнеш мацней, дзверы і адчыняцца. Такі лік-без прыводзіць да абмеркаванняў, як трапіць дахаты, калі ўчора быў адзін код, а сёння іншы, — відавочна, нехта ўжо на практыцы апрабаваў парады. У выніку дзверы знадворку ў пад'езд часта стаяць адчыненыя ці са зламаным замком, а коды цяпер стараюцца не паведамляць без асаблівай патрэбы нават жыхарам. Аб тым, што рабіць, каб запорна-перагаворныя прылады (ЗПП) выконвалі першапачатковую функцыю: ахоўвалі бяспеку і чысціню, як выкарыстоўваць коды да дамафонаў, і з кім заключаць дагавор на абслугоўванне, «Звязда» паразважала разам са спецыялістамі. СТАР. 4

Спецыяльны рэпартаж

КЛОПАТ МОЦНЫХ РУК

Як сапраўдныя мужыкі засвойваюць «жаночую» справу

У апошнія гады тэма раўнапраўя паміж мужчынамі і жанчынамі перажывае новую хвалю росквіту. Аднак яна мае быццам аднабаковую накіраванасць: на першы погляд здаецца, што прасачыцца на «чужую» тэрыторыю імкнуцца толькі дзяўчаты. Яны ўпарта даказваюць, што могуць кіраваць фурамі, ісці ў палітыку і ратаваць людзей на пажарах. Пры гэтым не забываюць расказаць грамадскасці пра свае дасягненні. У СМІ гісторыі жанчын, якія дабіліся поспеху ў мужчынскіх прафесіях, з'яўляюцца з зайздроснай рэгулярнасцю. У той час як аб прадстаўніках моцнага полу, што працуюць у традыцыйна жаночых сферах, амаль не чуваць. Але такія ёсць, і іх нямала. «Звязда» пазнаёмілася з мужчынамі, чые працоўныя абавязкі — гэта догляд за хворымі і інвалідамі.

«Пра такое не мараць у дзяцінстве»

Калі б вы сустрэлі барысаўчаніна Аляксандра Саковіча на вуліцы ў звычайны будны дзень, то ні за што б не здагадаліся, дзе ён працуе. Малады мужчына ўражвае ўменнем трымацца на публіцы і навыкамі камунікацыі. Такія ў наш час займаюць пасады менеджараў ці кіруюць крэатыўнымі групамі ў стартапах. Ніяк не чакаеш пачуць ад іх: «Я санітар у псіханеўралагічным інтэрнаце». СТАР. 5

КАРАТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўхваліў праекты пагадненняў па візах і рэадмісіі з ЕС.
- Папуляцыя высакароднага аленя ў Беларусі за 12 гадоў вырасла больш чым у два разы.
- **Пяць кампаній з Азіі і Еўропы падалі заяўкі на конкурс па будаўніцтву азотнага комплексу ў Гродне.**
- Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў плануе зарабіць сёлета на замежным турызме каля 1 мільёна еўра.
- **ДАІ Мінска запусціла праграму «Мабільны інспектар». Яна дазваляе кантраляваць паводзіны на дарозе кіроўцаў — нерэзідэнтаў Беларусі, адсочваючы іх парушэнні ў рэжыме рэальнага часу.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на IV квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ «БЕЛАРУСКАГА ЗОЛАТА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З палёў ужо ўбралі амаль 40 % бульбы, ураджайнасць — 325—330 цэнтнераў з гектара, але ў фермерскіх гаспадарках яна значна вышэйшая. «Ужо сёння трэба мець 400—450 (цэнтнераў з гектара. — **«Зв.»**)», — абазначыў планы па павышэнні ўраджайнасці Прэзідэнт.

Уборка сіласных кармоў ідзе з адставаннем. Нарыхтавалі на сілас пакуль толькі каля 30% кукурузы. Яна сёлета ўрадзіла. «Трэба мець на ўвазе, што тут гнутка трэба працаваць. Цяпер пакінем на зерне, будзем спадзявацца, што надвор'е дазволіць нам сабраць, — сказаў лідар дзяржавы.— Каб мы не праглядзелі, бо і сіласу не атрымаем, і будзем потым камбайны цягаць трактарамі...»

Важна цяпер, па словах Прэзідэнта, убіраць кукурузу з нізінных палёў, ураджай на якіх можа затапіць дождж.

«Бульбу мы збяром — ніколі такога не было, каб не сабралі. Калі трэба, падключайце людзей. Буракі таксама збяром, гэта ж машынная ўборка. Там жа ручной працы не трэба, — адзначыў кіраўнік краіны. — Галоўнае зараз — кукуруза. Тактыка — не страціць сілас і зерне. Найважнейшае пытанне сёння — пасеяць азімыя, да 1 кастрычніка трэба ўсё скончыць».

Гродзенскай вобласці сёлета давядзецца дадаткова закупляць зерне. Крыху падвяло аграрыяў надвор'е. Але Прэзідэнт заўважыў, што ківаць на прыродныя ўмовы не варта. Трэба прыстасоўвацца да іх і мяняць стратэгію высявання зерня. У год вобласць павінна мець не менш за 1,5 мільёна тон чыстага зерня. А дасягнуць гэтага магчыма, толькі выконваючы тэхналогіі. Менш сёлета збяруць у вобласці і яблыкаў.

На тэрыторыі Карэліцкага раёна размяшчаецца 13 аграгарадкоў і 10 гаспадарак. Па словах старшыні райвыканкама Віктара Шайбака, задача для рэгіёна — захаваць рабочыя месцы і інфраструктуру вёсак. Істотных праблем (у тым ліку і недахопаў кармоў) у раёне няма. «Чаму ў цябе заўсёды Карэлічы выдзяляюцца?» — задаў пытанне Аляксандр Лукашэнка старшыню Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміру Краўцову. На думку апошняга, справа тут не толькі ў больш ураджайнай глебе, а і ў кваліфікаваных кадрах. «Ну дык трэба вучыцца ў яго і паўтараць гэта. Іншага нам не дадзена», — адзначыў Прэзідэнт.

«Залатое руно» беларусаў

Асноўны пункт у рабочай паездцы Прэзідэнта — знаёмства з тэхналагічнымі працэсамі перапрацоўкі лёну на ААТ «Карэлічы-Лён». Прадпрыемства мае два падраздзяленні: у Карэлічах і Лідзе. Льнотрасту вырошчваюць на арандаваных землях Карэліцкага, Навагрудскага і Лідскага раёнаў. За сем месяцаў 2019 года выпрацавана 527,3 тоны льновалакна.

Лёну сёлета нарыхтавана на 40—50 % больш, чым летась. Практычна ўсе заводы рэспублікі працуюць на поўную загрузку. Прыкладам у галіне льнаводства для лідара краіны з'яўляецца Гродзеншчына, дзе ў сферы льноапрацоўкі склалася сістэма. Сёння на сямі тысячах гектараў вырошчваюць сыравіну для двух мадэрнізаваных ільноапрацоўчых заводаў. Цяпер перапрацоўваюць 24 тысячы тон трасты.

Поспехам у гэтай галіне не можа пахваліцца Віцебская вобласць. На 13 тысячах гектараў вырошчваюць лён для васьмі заводаў, але такога сістэмнага падыходу, як у Карэлічах, няма. «Можа, і восем трэба там заводаў, можа, дзесьці плошчы дабавіць, трэба сесці паглядзець з ільнокамбінатам. Віцебская вобласць заўсёды ў нас у два разы, да 25 тысяч (гектараў. — **«Зв.»**), па-мойму, вырошчвала льну», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

На патрэбы галіны ў Навагрудку працуе льнонасеннестанцыя. Але 33 % плошчы апрацоўваецца пад імпартнае насенне, астатняя — пад айчыннае. Сёлета прадукцыйнасць замежнага насеннага матэрыялу, па словах гродзенскіх ільнаводаў, на 15—20 % вышэйшая.

«Размова па выніках гэтага года будзе вельмі сур'ёзная па лёну. Вельмі, таму што гэты год паказальны. Так, дзесьці падсушыла, але ў цэлым нармальны ж для лёну год. Вось і паглядзім, на што вы выйшлі. Жалезная павінна быць тэхналагічная дысцыпліна. Не ўмееце, не хочаце — не сейце», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На ААТ «Карэлічы-Лён» Аляксандру Лукашэнку паказалі парк сельскагаспадарчай тэхнікі, якую выкарыстоўваюць у рабоце з «беларускім золатам». Мясцовае кіраўніцтва адзначыла недахоп машын для перадпасяўной апрацоўкі глебы. Выслухаўшы даклад па парку, Прэзідэнт падвёў вынікі: «Нам трэба вызначыцца з тэхнікай. Вось цяпер «Гомсельмашу» даручым — яны зробяць! А ці трэба нам рабіць? Ці зможам мы яе зрабіць? Можа, невялікую колькасць давядзецца закупіць». Асноўныя дэталі прапанавана купіць, а некаторыя часткі па сілах зрабіць і беларускім машынабудаўнікам.

Ствараюць на прадпрыемстве і сваё «суперпаліва» — брыкеты кастрыцы. Ім ацяпляюць мясцовыя школы, ФАПы, бальніцы і сам завод. Прадпрыемства амаль безадходнае.

«Як у Карэлічах, так павінна быць на ўсіх ільнозаводах па ўсёй краіне. Лепш не трэба. Вось гэта зрабіце — і ўсё», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт паабяцаў пры неабходнасці аказаць падтрымку льнозаводам у пераабсталяванні, у тым ліку фінансавую.

Ствараючы сістэму

Пасля азнаямлення з прадпрыемствам ААТ «Карэлічы-Лён» Прэзідэнт паразмаўляў з супрацоўнікамі завода і адказаў на іх пытанні.

Па-першае, ён патлумачыў, чаму прыехаў у Карэлічы. Аднаўленнем ільнаводства ў краіне заняліся шмат гадоў таму. Улічваючы ўсе недахопы, улады рашыліся заснаваць новыя заводы і лініі. І па словах Прэзідэнта, да Гродзенскай вобласці сёння прэтэнзій няма.

У Карэлічах яго цікавіла, як выбудавана сістэма вытворчасці лёну. «Я думаў раней, калі мы ўвязаліся ў гэту вайну па выратаванні льнаводчай прадукцыі, што, можа быць, на рынку і нягоднай будзе гэта прадукцыя. Я перажываў за гэта, канешне, таму што грошай укладалі нямала. Сёння мы ўпэўненыя ў тым, што зрабілі правільна. У Беларусі заўсёды стваралі дастатковую колькасць лёну — больш, чым цяпер. Але, каб перапрацаваць і загрузіць наш ільнокамбінат у Оршы, нам трэба 50-52 тысячы тон валакна. Мы яго сёлета атрымаем, і нядрэннай якасці», — паведаміў Прэзідэнт.

У будучыя гады ніжэй гэтай планкі галіна апусціцца не мае права, каб супрацоўнікі атрымлівалі дастойныя заробкі і быў забяспечаны экспарт «беларускага золата».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, пасля заканчэння ўборкі лёну ўлады яшчэ раз вернуцца да праблем гэтай галіны і разгледзяць, чаго не хапае льнаводству ў Беларусі. Сістэму работы з беларускім «залатым руном» на Гродзеншчыне кіраўнік краіны назваў добрай, і яна будзе скапіравана ў іншых абласцях.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што даў даручэнне віцэ-прэм'еру і міністру, якія адказваюць за сельскую гаспадарку, вызначыць, якое трэба насенне, якая тэхніка, наколькі рэнтабельна самім ствараць машыны для работы з лёнам.

«Ваш старшыня райвыканкама правільна сказаў, што нам неабходны камбінаваны агрэгат, які б раўняў глебу, рыхтаваў і адразу высяваў. У нас ёсць па пасеве збожжавых культур такі агрэгат. Чаму мы не можам прыстасаваць яго для апрацоўкі лёну? Можам», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

На вырашэнне ўсіх пытанняў галіны (ад насення да перапрацоўкі лёну) вызначаны тэрмін у адзін-два гады.

Адказваючы на пытанне супрацоўніцы ААТ «Карэлічы-Лён» пра перадвыбарчую кампанію, Прэзідэнт адзначыў, што яе «правядзём, як заўсёды, спакойна, ціха, нягледзячы на жаданне некаторых надаць афарбоўку шоу».

На думку Аляксандра Лукашэнкі, у парламенце павінна быць моладзь, грамадзяне сярэдняга ўзросту, людзі, якія толькі выйшлі на пенсію ці перадпенсійнага ўзросту, і старыя людзі. Гэтым слаям неабходна быць у заканадаўчым органе, каб прадстаўляць інтарэсы ўсяго народа.

«Нам патрэбны працаздольны парламент, а не крыкуны», — сказаў лідар краіны.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў наконт прапановы выбіраць парламент па партыйных спісах: «Вы будзеце ведаць у найлепшым выпадку пяць партый і іх кіраўнікоў. Людзі звычайна галасуюць за лідара. А там па спісе ўжо ніхто не ведае. Яны самі паставяць там дзяцей, унукаў, палюбоўніц, палюбоўнікаў, усіх туды прапішуць. Я сказаў: не. Мы пакуль не зжылі мажарытарную сістэму».

Што датычыцца бягучай выбарчай кампаніі, ён падкрэсліў: «Мы правядзём гэтую перадвыбарчую кампанію спакойна. Гэта рэпетыцыя заўтрашняй кампаніі — прэзідэнцкай. Вось там нам падкінуць перцу. А мы павінны мазгі ў рукі ўзяць і спакойна, як заўсёды беларусы гэта рабілі, зрабіць так, як трэба нам. А не камусьці на захадзе, усходзе, поўдні або поўначы».

Карыстаючыся магчымасцю Аляксандр Лукашэнка павіншаваў жыхароў Гродзеншчыны з юбілеем рэгіёна. У вобласці знаходзяцца перспектыўныя шматгаліновыя гаспадаркі, якія змаглі захаваць толькі беларусы. «Усё Гродзенская вобласць умее рабіць, але трэба сёння дадаваць. І я думаю, што калі задачы ставіць перад гродзенцамі і калі налета 15—20 % дабавіце, — героямі будзеце, — адзначыў Прэзідэнт. — Вы ствараеце сістэмы. І гэта характэрная рыса вашага губернатара. Я даўно яго ведаю, малайчына. Трэба сістэмы заўсёды ствараць».

Падводзячы вынікі размовы, Прэзідэнт назваў Карэліцкі раён адным з найлепшых у рэспубліцы, у якога павінны вучыцца і іншыя рэгіёны.

Марыя ДАДАЛКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Вучыч заявіў, што ЗША чакаюць ад Сербіі прызнання незалежнасці Косава

Злучаныя Штаты чакаюць, што Сербія прызнае незалежнасць самаабвешчанага Косава. Пра гэта заявіў учора прэзідэнт Сербіі Аляксандар Вучыч у эфіры канала Pink.

«Ці памянялі ЗША сваю пазіцыю, ці стала яна лепшай? Я не скажу бы. Для нас гэта цяжкая праца. ЗША чакаюць ад Сербіі, вы гэта бачылі ў лісце прэзідэнта Трампа, каб мы прызналі незалежнасць Косава. Не трэба падманваць народ, у больш мяккай форме гэта скажуць і астатнія заходнія краіны, якія прызналі Косава», — сказаў ён.

«Так ідуць рэчы на Захадзе. Што нам тым часам удаецца, дык гэта ўказваць на сваю пазіцыю», — сказаў сербскі лідар. Паводле яго слоў, у ходзе маючага адбыцца пасяджэння Генасамблеі ААН у яго запланавана шмат сустрэч, цэнтральнай тэмай якіх будзе Косава.

У апошні год Бялград і Прышціна актыўна абмяркоўвалі нейкае кампраміснае рашэнне, звязанае з карэкціроўкай межаў і абменам тэрыторыямі.

Аграрыі ў розных рэгіёнах Украіны выйшлі на акцыі супраць продажу зямлі замежнікам

Аграрыі ў розных рэгіёнах Украіны праводзяць акцыі пратэсту ў сувязі з планамі ўлад краіны па адкрыцці рынку зямлі сельскагаспадарчага прызначэння.

«Сёння ў нас праходзіць мірная акцыя ў многіх гарадах Украіны. Учора быў вялікі зямельны форум, на якім прэзідэнт Украіны заявіў, што ўкраінская зямля будзе прадавацца толькі ўкраінцам і ўкраінскім кампаніям. Далей у дыскусіі мы зразумелі, што ўласнікамі ўкраінскіх кампаній могуць быць замежнікі», — заявіў у эфіры тэлеканала «112 Украіна» кіраўнік Усеўкраінскага аграрнага савета Андрэй Дзікун.

Ён падкрэсліў, што ўкраінскія аграрыі занепакоеныя перспектывай, якая склалася. «Яшчэ ні адна краіна ў свеце, якая адкрывала рынак зямлі, на першым этапе не пускала ніякіх замежнікаў. Мы сюды сёння прыйшлі ў першую чаргу каб звярнуць увагу грамадства і ўкраінскай улады на гэтае пытанне», — растлумачыў ён. Дзікун нагадаў, што пытанне аб рынку зямлі датычыцца кожнага жыхара Украіны, бо «аграрны бізнес — гэта 17 % ВУП і 40 % валютнай выручкі краіны».

Удзельнікі пратэстаў стаяць уздоўж трас разам са сваёй прыпаркаванай на ўзбочынах тэхнікай, грузавымі аўтамабілямі і трактарамі. Яны трымаюць плакаты са сваімі патрабаваннямі, аднак дарогі не перакрываюць, сутыкненняў не адбываецца.

Амерыканскі генерал расказаў аб планах ЗША па нападзе на Калінінградскую вобласць



Стратэгічны бамбардзіроўшчык ВПС ЗША У-52 у сакавіку гэтага года імітаваў нанясенне ўдару крылатымі ракетамі па Калінінградскай вобласці Расіі. Пра гэта паведаміў часопіс The National Interest. Паводле яго даных, гэтая аперацыя праводзілася ў рамках перакідвання пяці бамбардзіроўшчыкаў з авіябазы ў штаце Луізіяна на авіябазу ў Вялікабрытаніі.

The National Interest адзначыў, што ў Калінінградскай вобласці разгорнута магутная сістэма СПА, Але, па словах камандуючага ВПС ЗША ў Еўропе генерала Джэфа Хэрыгана, узброеныя сілы ЗША распрацавалі планы, якія дазваляюць узламаць гэтую абарону. «Гэта была б шматэлементная, дакладна разлічаная па часе аперацыя з выкарыстаннем эфектыўных сродкаў, якія мы б задзейнічалі для таго, каб гарантаваць сабе доступ у раён, — заявіў генерал групе журналістаў. — Для гэтага мы і праводзім вучэнні. Мы пастаянна праводзім ацэнку сваіх планаў, і калі справа дойдзе да іх выканання, то мы будзем гатовыя».

«Шчыт Саюза — 2019»: усе задачы выкананы!

На расійскім палігоне Муліна завяршылася сумеснае аператыўнае вучэнне Узброеных сіл Беларусі і Расіі. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.

Выступаючы перад удзельнікамі вучэння, кіраўнік абароннага ведамства Беларусі Андрэй Раўкоў адзначыў:

— Сумеснае аператыўнае вучэнне падышло да свайго лагічнага завяршэння. Зусім хутка нашы вайскоўцы вернуцца на Радзіму. Задачы, якія ставіліся на вучэнні, дасягнуты. Сістэма падрыхтоўкі нашых Узброеных Сіл і Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, якая закладзена ў планы баявой падрыхтоўкі па прызначэнні, дазваляе нам планамерна забяспечваць пастаянную гатоўнасць да выканання сумесных задач у рамках абароны Саюзнай дзяржавы і нашых краін ад умоўнага праціўніка.

Асаблівасць гэтага вучэння ў тым, што беларусы выконвалі практычна ўсе задачы ў начных умовах. Побыт іх быў наладжаны так, каб нішто не адцягвала ад асноўнай місіі.

Нашы вайскоўцы цяпер рыхтуюцца да вяртання ў Беларусь.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Сацыяльны вектар

Галоўнае — жыццё

Як паставіць заслону вытворчаму траўматызму?

Толькі за гэты тыдзень у нашай краіне загінулі на сваіх рабочых месцах чатыры чалавекі — жывёлавод, электраманцёр і два работнікі лесанарыхтоўкі. А ўсяго за мінулыя восем месяцаў гэтага года на вытворчасці ад няшчасных выпадкаў загінулі 96 чалавек, калецтвы атрымалі 492 чалавекі. Гэтыя звесткі былі агучаны на праведзенай учора сумеснай нарадзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны па пытаннях прафілактыкі вытворчага траўматызму. Асноўная праблема, узнятая на нарадзе: як стварыць бяспечныя ўмовы працы і спыніць рост траўматызму на вытворчасці.

— На працягу шэрагу гадоў у нас зніжаўся вытворчы траўматызм, — заявіла журналістам **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.** — Калі паглядзець з 1992 года, то каэфіцыент частаты вытворчага траўматызму знізіўся больш чым у 10 разоў. Гэта сур'ёзны вынік. Але 2018 год паказаў негатыўную тэндэнцыю з пункту гледжання росту. Бягучы год таксама выклікае сур'ёзную заклапочанасць. Таму было прынята рашэнне распрацаваць шэраг дадатковых мер.

У нашай краіне выбудаваная сістэма кантролю за бяспекай працы. З боку дзяржавы гэтымі пытаннямі займаецца Дзяржаўная інспекцыя працы. Ёсць і грамадскі кантроль — гэта тэхнічная інспекцыя працы прафсаюзаў. Але сёння, па словах міністра, нам ёсць над чым працаваць з пункту гледжання скаардынаванасці дзеянняў гэтых дзвюх інстанцый. «Мы хочам злучыць наступныя кірункі: кантроль з боку дзяржавы і грамадскі кантроль», — заявіла Ірына Касцевіч.

У чым будзе заключацца каардынацыя намаганняў? «Мы будзем каардынаваць дзеянні, каб тэхнічны інспектар працы Федэрацыі прафсаюзаў і нашы дзяржаўныя інспектары не хадзілі на адно і тое ж прадпрыемства ўдваіх. І чым большую колькасць прадпрыемстваў мы ахопім, тым лепш», — сказала міністр працы і сацыяльнай абароны. Пры гэтым яна адзначыла, што сёння Дэпартамент перш за ўсё праводзіць маніторынг, абследаванне прадпрыемстваў, гэта, па яе словах, — «не выхад на праверку».

— Сёння ў прафсаюзаў ёсць вельмі добры інстытут грамадскіх кантралёраў, якія забяспечваюць кантроль непасрэдна на прадпрыемстве, — адзначыла Ірына Касцевіч. — Наша задача — перш за ўсё ўзняць іх прафесійны ўзровень. Будзем праводзіць семінары, канферэнцыі, круглыя сталы з грамадскімі кантралёрамі. Падрыхтуем сумесную памятку, на што звяртаць увагу на прадпрыемстве.

Адначасова, як лічыць міністр, трэба ўзмацніць стымулюючую функцыю ў дачыненні да людзей, якія ўзялі на сябе такую грамадскую работу.

На сённяшні дзень у рэспубліцы ва ўсіх раёнах разгорнуты мабільныя групы. І каб сапраўды якасна аказаць садзейнічанне прадпрыемству і даць прадпісанне для ліквідацыі негатыўных момантаў, у такой мабільнай групе, на думку Ірыны Касцевіч, абавязкова павінен

быць прафесіянал — альбо дзяржаўны інспектар, альбо тэхнічны інспектар ад прафсаюзаў.

* * *

Па звестках тэхнічнай інспекцыі працы ФПБ, асноўнымі прычынамі траўматызму са смяротным вынікам з'яўляюцца невыкананне наймальнікамі службовых абавязкаў па стварэнні здаровых і бяспечных умоў працы, парушэнне самімі пацярпелымі працоўнай дысцыпліны, патрабаванняў правілаў аховы працы, а таксама допуск работнікаў да працы без навучання і праверкі ведаў па пытаннях аховы працы.

Каб своечасова выявіць гэтыя парушэнні і мінімізаваць колькасць няшчасных выпадкаў на вытворчасці, тэхнічная інспекцыя працы ФПБ толькі за шэсць месяцаў бягучага года правяла больш за тры тысячы праверак і маніторынгаў аховы працы. Па іх выніках было выяўлена звыш 25,5 тысячы парушэнняў.

Галіны, у якіх найбольш высокі ўзровень вытворчага траўматызму, — гэта сельская гаспадарка, будаўніцтва, апрацоўчая прамысловасць і транспарт.

— Мы разумеем, што прытрымліванне тэхнікі бяспекі з'яўляецца галоўнай умовай для захавання жыцця і здароўя людзей, — заявіў на нарадзе **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА.** — Часам невыкананне элементарных правілаў бяспекі прыводзіць да трагічных наступстваў. Калі мы праводзім прафсаюзныя расследаванні, чуем вельмі шмат довадаў пра тое, што тэхніка старая, рэсурсаў няма, грошай не хапае. Але сёння абсалютна відавочна адно: жыццё — гэта самае дарагое і каштоўнае, і на гэтым эканоміць нельга. Захаваннем тэхнікі бяспекі і стварэннем бяспечных умоў працы павінны займацца абсалютна ўсе. І самі работнікі павінны турбавацца аб сваёй асабістай бяспецы, і наймальнік. Пры гэтым прафсаюзы бачаць неабходнасць змены шэрагу заканадаўчых нормаў, і мы будзем ініцыяваць такія прапановы. Таксама мы лічым, што неабходна памяняць падыходы ў рабоце тэхнічных грамадскіх інспектараў на вытворчасці. І мы бачым, што трэба зрабіць у гэтым кірунку.

У рамках нарады было падпісана Пагадненне паміж Мінпрацы і ФПБ аб супрацоўніцтве па пытаннях стварэння бяспечных і здаровых умоў працы і прафілактыкі вытворчага траўматызму.

Святлана БУСЬКО.

ДУХОЎНЫЯ СІМВАЛЫ БЕЛАРУСІ

Святкаванне 550-годдзя здабыцця цудатворнай Жыровіцкай іконы Божай Маці і 500-годдзя з дня заснавання Свята-Успенскага Жыровіцкага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра павінна прайсці на высокім узроўні. Пра гэта заявіў намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка на пасяджэнні рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў.

«Жыровіцкая ікона шырока вядомая не толькі як цудатворны вобраз, але і як унікальная мастацкая, гісторыка-культурная з'ява. Яна шануецца і праваслаўнымі вернікамі, і католікамі. З абразом непарыўна звязана гісторыя Свята-Успенскага манастыра, комплекс з'яўляецца адным з самых маштабных архітэктурных ансамбляў XVII—XVIII стагоддзяў на тэрыторыі краіны. За сваю гісторыю ён ні разу не закрываўся, захоўваючы пераемнасць традыцый на працягу пяці стагоддзяў», — адзначыў Ігар Петрышэнка.

Ён назваў гэтыя святыні нацыянальным культурным здабыткам Беларусі, духоўнымі сімваламі народа. Паводле слоў віцэ-прэм'ера, важна прыцягнуць да падзеі як мага больш грамадзян. Падрыхтоўка да святкавання павінна ўключаць патрыятычную, выхаваўчую і духоўна-маральную работу з дзецьмі і моладдзю. Прапануецца арганізаваць тэматычныя ўрокі і канферэнцыі, конкурсы творчых работ.

Фота БелТА.

Ігар Петрышэнка акцэнтаваў увагу на турыстычным патэнцыяле рэгіёна, які пакуль, на жаль, выкарыстоўваецца недастаткова. «Жыровіцкі манастыр вядомы далёка за межамі краіны. І трэба ў поўнай меры задзейнічаць юбілейныя мерапрыемствы для прыцягнення турыстаў. Неабходна своечасова і якасна падрыхтаваць даведачна-інфармацыйныя матэрыялы па гісторыі манастыра і Слонімшчыны, размясціць іх на інфармацыйных рэсурсах, у тым ліку на сайтах замежных устаноў, і не толькі ў рускамоўнай версіі», — сказаў ён.

Акрамя таго, тэма значнасці святыні не толькі для Беларусі, але і для хрысціянства ў цэлым будзе падымацца ў рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ, СМІ Саюзнай дзяржавы, царкоўных выданнях.

Урачыстасці пройдуць у маі 2020 года.

Памяць аб падзеі і знак добрых адносін людзей

У «Музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці», філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея, адбылася прэзентацыя і ўрачыстая перадача ў фонды музея «Пояса дружбы», які быў створаны ўдзельнікамі II Еўрапейскіх гульняў.

Падчас правядзення мультыспартыўнага форуму менавіта Нацыянальны гістарычны музей быў арганізатарам Цэнтра беларускай культуры ў Вёсцы атлетаў. Госці з усіх краін-удзельніц там знаёміліся з беларускімі традыцыямі, нацыянальнымі касцюмамі, прадметамі побыту, музычнымі інструментамі і творамі мастацтва.

Прадстаўнікі камандаў з розных краін у час свайго знаходжання ў Цэнтры прыклалі руку да стварэння «Пояса дружбы», госці з 35 краін уплялі свае добрыя думкі, надзею, выдатны настрой ва ўзор гэтага чатырохметровага пояса. Цяпер ён як памяць аб знакавай падзеі і сімвал добрых адносін людзей з розных краін будзе захоўвацца ў фондзе Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

«Самае важнае, што панавала ў гэтым Цэнтры ў вёсцы атлетаў, акрамя ўнікальнай калекцыі, выдатная атмасфера сяброўства і зносін, — расказвае **дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Павел САПОЦЬКА.** — У чэрвені ў Беларусь прыехалі не проста спартсмены, а носьбіты розных культур, нам важна было пазнаёміць іх з нашай культурай. «Пояс дружбы» цяпер з'яўляецца сімвалам салідарнасці, адзінства і гэтай цудоўнай падзеі, якая адбылася ў нашай краіне».

Прадстаўнік Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Сяргей ГАНЧАРЭНКА адзначыў, што ў «Поясе дружбы» «спалучаецца спорт, народная культура і мастацтва, пранікненне розных культур адна ў адну».

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Запрашальнік

«Барселона» ляціць у Брэст

21 і 22 верасня ў Брэсце пройдзе міжнародны турнір Millennium Cup

У ім возьмуць удзел шэсць камандаў, складзеных з футбалістаў, не старэйшых, чым 2005 года нараджэння: «Ягелонія», «Кайрат», БАТЭ, «Дынама-Брэст», «Барселона» і «Дняпро». Усе матчы пройдуць на стадыёне «Юнацтва».

Генеральны менеджар брэсцкага «Дынама» Максім КРАСНАБАЕЎ паведаміў пра гэтую падзею. «Раней у СМІ мы падаравалі цікавасць аўдыторыі да будучага турніру, але толькі цяпер, калі атрыманы пацвярджэнні ўсіх камандаў-удзельніц, у тым ліку і «Барселоны», мы можам сказаць: так, у нас атрымалася! Гэтая падзея стане яшчэ адным падарункам гораду ў яго 1000-годдзе. Усім добра вядомы ўзровень акадэміі Барселоны. Арганізаваць яе прылёт у Брэст нам каштавала немалых намаганняў, бо вывезці выхаванцаў акадэміі за мяжу падчас навучальнага года практычна немагчыма. Аднак мы рады, што кіраўніцтва клуба зацікавілася нашай прапановай і пайшло насустрач. Дзеля гэтай ідэі давялося нават перанесці матч чэмпіянату Іспаніі. Безумоўна, будучы турнір — гэта велізарны вопыт для ўсіх камандаў-удзельніц, у тым ліку для нашага клуба, які выступае яго арганізатарам. Мы зробім усё магчымае, каб і ўдзельнікі Millennium Cup, і аматары футбола атрымалі задавальненне ад гульні нумар адзін».

Плануецца, што ўсе матчы можна будзе ўбачыць не толькі на стадыёне (уваход туды вольны), але і з дапамогай трансляцый на клубным канале FCDB TV.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Як нас дураць

Ужо з'явіліся лжэперапісчыкі

Напярэдадні перапісу насельніцтва, які пройдзе ў кастрычніку, як паведамляе аддзел інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама, актывізаваліся махляры.

Жыхарам абласнога цэнтра пачалі паступаць тэлефонныя званкі ад асоб, якія нібыта задзейнічаны ў працэдуры перапісу. У ходзе тэлефоннай размовы лжэперапісчыкі спрабуюць выведаць асабістую інфармацыю, у тым ліку даныя банкаўскіх картак, а ў далейшым здзейсніць крадзеж грашовых сродкаў.

Міліцыя нагадвае, што пры правядзенні апытання насельніцтва перапісчык абавязаны прад'явіць спецыяльнае пасведчанне і пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Таксама ён будзе мець сумку з лагатыпам перапісу і планшэт. Перапіс насельніцтва не ажыццяўляецца па каналах тэлефоннай сувязі, таму, калі вам патэлефанавалі і прадставіліся асобай, якая ажыццяўляе перапіс, ведайце — гэта махляр. І ўжо ні ў якім выпадку не перадавайце такім асобам інфармацыю пра вашы банкаўскія карткі.

Калі вы сутыкнуліся з падобнымі фактамі, неадкладна паведаміце ў міліцыю па тэлефоне 102.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

КОД ПАДБЯРЫ НА РАЗ-ДВА-ТРЫ

Не заключыш дагавор — адключым дамафон

У пачатку 2000-х у Мінску распачалася праграма «Закрыты пад'езд». Пакрысе амаль усе дзверы былі абсталяваны ЗПП ці кодавымі металічнымі замкамі, адчыніць якія можна было не толькі ключом, але і з дапамогай кода, што паведамілі супрацоўнікам спецыяльных службаў: камунальнікам, паштавікам, медыкам і іншым. Для іх не рабілі ніякіх спецыяльных кодаў, а раздаваць ключы тады было дорага. Зразумела, ведалі коды і жыхары. У выніку ў пачатку 2013-х коды ўжо ведалі ўсе, і любы мог трапіць у які заўгодна дом. Пачалася барацьба з раздачай «ахоўных лічбаў» і перакадзіроўка дамафонаў аж да індывідуальнага шыфру на кожную кватэру. А яшчэ... спрэчкі за спажыўца паміж арганізацыямі, што абслугоўваюць дамафонныя сістэмы, якіх з часам таксама стала значна больш.

Устаноўка дамафоннай сістэмы — дадатковая жыллёва-камунальная паслуга. На яе пастаўку трэба заключаць індывідуальны дагавор. Пры гэтым пералік паслуг па абслугоўванні і рамонце ў дагаворах з рознымі арганізацыямі дамафоншчыкаў можа адрозніваццa, кажа **Рыгор КАЗУНКО, намеснік дырэктара па эксплуатацыі жыллёвага фонду ЖКГ Заводскага раёна Мінска.**

Спажывец, напрыклад, можа ўвогуле адмовіцца ад гэтай паслугі. Аднак дамафон яму ў такім разе не падключаць. Тым не менш праблема ў тым, што людзі часта не ведаюць, хто абслугоўвае іх дамафон і дзверы ў пад'ездзе.

— Хто сёння дыктуе ўмовы дагавораў, якія заключаюцца са спажыўцамі па абслугоўванні ЗПП? — цікавіцца **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ,** і сам жа адказвае: *— Усе дагаворы павінны праходзіць*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

экспертызу заказчыка, і ён мусіць пацвердзіць, што пэўная арганізацыя правамоцная аказваць паслугу ў гэтым доме і пад'ездзе і можна з ёй заключаць дагавор.

Рыгор Казунко на гэта заўважае, што падобная інфармацыя ёсць на сайце адміністрацыі раёна, а на інфармацыйных стэндах змешчаны прапановы звяртацца ў службу 115, калі ёсць пытанні па ЗПП.

У новай рэдакцыі Закона аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) мяркуецца змяніць падыход да дзейнасці дамафоншчыкаў, што, на думку **старшыні Асацыяцыі «Бяспечны дом» Генадзя ЗАХАРАВА,** закранае пытанні прававога рэгулявання ў сферы дадатковых паслуг, якія аказваюцца на канкурэнтнай аснове. Замест асобных прамых дагавораў паміж спажыўцамі і пастаўшчыкамі паслугі прапануецца заключыць адзін агульны дагавор па кіраванні агульнай маёмасцю. У той жа час ад пастаўшчыкоў паслуг патрабуюць заключаць прамыя дагаворы з людзьмі:

— Па распараджэнні Мінжылкамгаса і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ) мы гэта робім ужо тры гады. Заключылі сотні дагавораў. Жыхары выбралі арганізацыю па абслугоўванні. Не заключана толькі 10 % дагавораў, дзе немагчыма знайсці ўласніка кватэры, які з'ехаў, здаў жыллё і г. д. Мяняць сітуацыю, каб дагаворы сталі нядзейснымі, няправільна. Гэта створыць паток скаргаў і зваротаў. Мы прапануем не чапаць тыя дагаворы, якія людзі ўжо заключылі з абслугоўваючымі арганізацыямі.

Абавязковага патрабавання перазаключаць дагавор нідзе не прапісана. Проста мясцовыя выканкамы разам са службай заказчыка не выконваюць закон аб ахове правоў спажыўцоў, мяркуе **Генадзь ТРУБІЛА, першы намеснік міністра ЖКГ:**

— Неабходна паведаміць спажыўцу, хто ў яго працуе на раёне. Бо прыходзяць у паштовыя скрыні паперы, дзе напісана: вам перапыняць абслугоўванне дамафона, калі вы з намі не заключыце дагавор. Чалавек, вядома, пужаецца і заключае. Праз месяц прыходзіць такая ж паперка ад іншай кампаніі. Што рабіць людзям? А яшчэ бывае, што адну і тую ж паслугу прыходзяць аказваць у адзін пад'езд некалькі розных арганізацый.

Ірына БАРЫШНІКАВА, намеснік начальніка ўпраўлення аховы правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, у сваю чаргу, прапануе прапісваць у законе магчымасць пакінуць дзейснымі ўжо заключаныя асабістыя дагаворы з жыхарамі і перанакіраваць іх на паўнамоцную асобу па агульным домаўладанні. І калі прэтэнзій няма — працягваць атрымліваць паслугі, калі ёсць — скасоўваць дагавор і мяняць пастаўшчыка.

Сакрэтны код і кабель «у пакеце»

Немалаважная праблема пры абслугоўванні ЗПП — коды на адкрыццё без ключа. Каму расказваць іх, дагэтуль вызначыцца цяжка нават спецыялістам. Раней пры заключэнні дагавораў жыхарам выдавалася па пяць ключоў (чатыры з іх куплялі). Таксама іх жа атрымлівалі, напрыклад, камунальнікі. Абслугоўваючыя арганізацыі запэўніваюць, што ні разу не адмаўлялі даць ключ хаус-майстру з ЖЭСа. Аднак гэта не значыць, што выдаваць ключы будуць бясконца і ўсім тым, хто згубіў, ці забыўся, ці некуды дзеў.

Дзеці і антысацыяльныя элементы называюць коды ўсім вакол, а некаторыя жыхары просяць сакрэтны код, бо шкадуюць грошай зрабіць чып, які, скажам, згубілі. Пры гэтым адмовіць ім нібыта і нельга. Так што пытанне, даваць ці не, застаецца адкрытым дагэтуль, бо, як той казаў, «забараніць нельга адмовіць» — стаў коску дзе хочаш.

Яшчэ адна праблема, звязаная з дамафоннымі сістэмамі, — пакетны прынцып пракладкі кабелю, у якім змяшчаюцца ўсе камунікацыі.

— Белтэлекам праводзіць свае энергасеткі з выкарыстаннем оптавалакна для цэлага пакета паслуг: ***тэлефон, інтэрнэт і ў тым ліку дамафон. І ўсё гэта праз адзін кабель з рознымі адгалінаваннямі,*** — абураецца Генадзь Захараў. *— Нашы майстры раз на месяц ходзяць і аглядаюць абсталяванне. Як нам фізічна магчыма будзе выдзеліць дамафонны кабель з гэтай сістэмы і правесці яго тэхабслугоўванне? Сумесна трэба вырашыць, як гэта зрабіць найлепш, і распрацаваць дакумент, які не выкліча скаргаў.*

— Пакетны прынцып — гэта ў пэўным сэнсе навязванне спажыўцу лішніх паслуг, — пагаджаецца Ірына Барышнікава. *— З агульнага оптавалаконнага кабелю сапраўды немагчыма выдзеліць дамафонны кабель. Цяпер арганізацыя разбіраецца з гэтым момантам. Па правілах аказання паслуг сувязі яны могуць прапаноўваць пакетныя паслугі, калі іх тэхнічна немагчыма падзяліць. Аднак ЖКП — гэта не паслуга сувязі, і камунальную паслугу па дамафонах навязаць спажыўцу яны не маюць права. Пра гэта дакладна напісана ў артыкуле 19 Закона аб ахове правоў спажыўцоў ЖКП.*

Установка дамафоннай сістэмы — дадатковая жыллёва-камунальная паслуга. На яе пастаўку трэба заключаць індывідуальны дагавор.

Не забыліся спецыялісты і пра пытанне электраэнергіі, якая патрабуецца для работы ЗПП, і аплата за якую праходзіць праз каштарысы ЖКГ. Эксплуатуючая фірма не нясе ніякіх затрат. Камунальнікі ж, наадварот, лімітаваны ў спажыванні энергіі ў месцах агульнага карыстання, за якую плацяць жыхары, таму за энергію на работу ЗПП павінна плаціць дамафонная арганізацыя, лічаць камунальнікі.

— Адна перагаворная прылада ў месяц спажывае каля 6 кВт. А жыхар плаціць за тэхабслугоўванне дамафона 93 капейкі з кватэры. Сюды, дарэчы, уваходзяць і рамонтныя работы, і гэта прапісана ў дагаворы, — кажа старшыня асацыяцыі «Бяспечны дом». *— Аднак гэтая сума ў лічбах нідзе не прапісана.*

У сваю чаргу, на замену панэлі ЗПП ці даводчыка дзвярэй патрабуецца прыблізна 100 рублёў, а робіцца гэта бясплатна, хоць рамонты такія зусім не рэдкія, а выдаткі арганізацый ніхто не лічыць, парыруюць дамафоншчыкі.

Відавочна толькі адно. Перш чым прымаць змены, трэба папрацаваць сумесна, каб выслухаць усе бакі і вывучыць акалічнасці работы кожнага. Прыняцце новай рэдакцыі закона чакаецца ўвосень у другім чытанні.

Ірына СІДАРОК. фота аўтара.

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	Смолевичское райпо, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133

Предмет аукциона

Месторасположение**: Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи, ул. Заречная, д. 3а**

Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер
Здание магазина № 15	93,9 кв. м	614/С-19450

Сведения о земельном участке: предоставлен Продавцу на праве аренды (сроком до 13.09.2035) общ. пл. **0,0643** га для обслуживания здания магазина № 15

Начальная цена с НДС 20 % – 48 339,10 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**30** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

50 % от цены продажи предмета аукциона оплачиваются в течение 5 банковских дней с момента подписания протокола о результатах открытого аукциона (для снятия запрета, установленного ОПИ), оставшаяся сумма с учетом ранее внесенного задатка оплачивается в течение 1 (одного) месяца после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 25.10.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 23.10.2019** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**.**

E-mail: auction@cpo.by

Извещение о проведении 23 октября 2019 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)	Капитальное строение с инв. номером 420/С-39301 (наименование – магазин № 14/30), общей площадью 1 153,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Железнодорожная, 12; капитальное строение с инв. номером 420/С-42217 (наименование – здание склада), общей площадью 135,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Железнодорожная, 12/1
Сведения о земельном участке	Площадь – 0,2426 га, кадастровый номер 441300000011000455, назначение – земельный участок для обслуживания многофункционального здания (для размещения объектов розничной торговли)
Продавец имущества	ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС	651 720,00 бел. руб.
Сумма задатка	65 000,00 бел. руб.
Условия торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1,5 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной Дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **23 октября 2019 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 23.09.2019 по 21.10.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).

КЛОПАТ МОЦНЫХ РУК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Гэтую прафесію я абраў свядома, шлях да яе быў доўгі. Адукацыя ў мяне чыгуначная. Пэўны час працаваў па спецыяльнасці — кіраваў цягнікамі, удзельнічаў у пракладцы новых дарог, аб'ездзіў усю Беларусь. А калі накруціў больш за паўмільёна кіламетраў, зняў форму чыгуначніка і сышоў у камерцыйную сферу — прадаваў шклопакеты. Разам з камандай працавалі ў Мінску і абласных гарадах, у маім родным горадзе Барысаве. Даволі хутка атрымалася падняцца па кар'ернай лесвіцы са звычайнага кансультанта да кіраўніка філіяла кампаніі. На той момант я ўжо паспеў ажаніцца і меў сына, мне добра плацілі. Здавалася б — жыві ды радуйся. Што яшчэ трэба? Але аднойчы я трапіў за мяжу... — Аляксандр робіць паўзу. — За мяжу плота Барысаўскага псіханеўралагічнага інтэрната. У той дзень зразумеў, што жыццё значна шырэйшае, чым я дагэтуль уяўляў, і яно не ва ўсіх аднолькавае. Прыйшлі думкі аб уласнай бездапаможнасці ў дачыненні да людзей, якія жылі ў інтэрнаце. Захацелася змяніць сітуацыю. Я купіў футбольны мяч і пачаў на выхадных заязджаць туды. Гулялі з хлопцамі ў футбол, а пасля пілі чай з печывам.

Праз пэўны час Аляксандр звольніўся са сваёй работы і стаў наведвацца ў інтэрнат штодзень, але ўладкавацца туды афіцыйна баяўся — палохала адказнасць за людзей. Здавалася, што без спецыяльнай адукацыі не справіцца. Прыкладна паўгода сышло на роздум, а ў 2010-м мужчына ўсё ж стаў санітарам.

— У абавязках — догляд за жыхарамі інтэрната, а гэта фактычна арганізацыя ўсяго побыту — ад асабістай гігіены і навядзення парадку ў пакоях да яды і транспарціроўкі. Людзі там розныя — ад тых, хто амаль страціў рухомасць, да вельмі актыўных. Таму я не проста чалавек, які даглядае, але яшчэ і строгі настаўнік, старэйшы брат, надзейны сябра, артыст, трэнер... Так, актыўна займаемся спортам — гэта ж не толькі гульня, хутчэй давер і ўзаемадапамога, — упэўнены мужчына. — Ад фізічнага болю выратуюць лекі, ад душэўнага пазбавіцца нельга, але яго можна суцішыць яскравымі момантамі жыцця і ўсмешкамі. Таму не было аніводнага дня, калі б я пашкадаваў аб сваім выбары.

Гісторыя Аляксандра Саковіча не ўнікальная. Сёлета ў Беларусі прайшоў першы прафесійны конкурс «Добрых рук майстры» для супрацоўнікаў малодшага медыцынскага персаналу з устаноў сацыяльнага абслугоўвання. З 25 санітараў і медсясцёр з псіханеўралагічных дамоў-інтэрнатаў і аддзяленняў кругласутачнага знаходжання пры ТЦСАН шасцёра — мужчыны.

— Калі б сказаў, што ў школьныя гады марыў аб прафесіі санітара, то пакрывіў бы душой, — прызнаецца Сяргей Курпель, які шэсць гадоў працуе санітарам у Клецкім псіханеўралагічным доме-інтэрнаце. — Са школьнай лаўкі я ведаў: маё прызванне — дапамагаць, лячыць, выратоўваць. Таму ў сярэдзіне 80-х паступіў у Віцебскі ветэрынарны інстытут і паспяхова яго скончыў. Ужо на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў я лячу жывёл. Аднак у 2013-м лёс склаўся так, што я з сельскагаспадарчай сферы перайшоў у сацыяльную. Увогуле, урач, санітар, фельдшар, інструктар — няважна. Галоўнае — дапамагаць тым, хто адчувае патрэбу ў табе.

Па словах Сяргея, складанасцяў у рабоце санітара дастаткова, але іх трэба не абмяркоўваць, а перамагаць.

Адрозненні ёсць, і гэта натуральна

Меркаванне, што догляд — справа, з якой лепш спраўляюцца жанчыны, стэрэатыпнае. Адкуль узнікла? Калі не ведаць спецыфіку працы санітара, то можа здацца, што гэты чалавек у пэўным сэнсе выконвае функцыі клапатлівай маці. Але ўсё нашмат складаней. Возьмем тыя ж дамы-інтэрнаты і аддзяленні кругласутачнага знаходжання, дзе жывуць дарослыя людзі. Нават калі яны губляюць магчымасць самастойна хадзіць, то ўсё роўна не ператвараюцца ў дзяцей. Аднак многія жанчыны — наўмысна ці не — не бяруць гэта пад увагу, і ў іх аўтаматычна ўключаецца «рэжым матулі». Яны пачынаюць «сюсюкаць» са сваімі пацыентамі, не разумеючы, што тым самым робяць толькі горш.

Мужчыны ў гэтым плане больш стрыманыя і не нагружаюць жыхароў інтэрнатаў лішнім «гучным клопатам». Калі яны прыйшлі сюды на работу, то засяроджваюцца на канкрэтных патрабаваннях сваіх падапечных і значна радзей даюць волю такому пачуццю, як жаль. Аднак варта зазначыць, што далёка не ўсім мужчынам уласцівае цярпенне.

Цікавае назіранне: сярод прадстаўнікоў малодшага медперсаналу часта сустракаюцца шматдзетныя матулі і бацькі. Напрыклад, у Аляксандра Саковіча — пяцёра дзяцей. А сярэбраны прызёр конкурсу «Добрых рук майстры» Святлана Плакса, якая працуе у Нясвіжскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў, увогуле мае ордэн Маці. Яна выгадавала шасцёра дзяцей, ужо 30 гадоў працуе санітарам і ўпэўнена, што адно другому не перашкода.

«Ёсць рукі залатыя, а ёсць добрыя», — кажа між сабой малодшы медперсанал пра сваю прафесію. Прэстыж, кар'ерны рост і вялікія заробкі — гэта не пра санітараў.

— Сюды прыходзіш не для таго, каб браць, а для таго, каб аддаваць — час, сілы, душу, — кажа супрацоўнік Капыльскага дома-інтэрната Сяргей Чэмікаў. — Усе мы людзі, усім нам патрабуецца цяпло і падтрымка. І калі я магу іх даць — чаму б мне гэта не зрабіць?

Назіраннямі пра матывацыю мужчын, якія ідуць у санітары, падзялілася **дырэктар Грозаўскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната Ірына ДАВІДОЎСКАЯ:**

— Утойваць не буду: калектыў у нас у асноўным жаночы. Калі возьмем дзённую змену, то ў ёй працуе пяць санітарак і два санітары. Асноўная нагрузка ў доглядзе за жыхарамі інтэрната прыпадае на плечы жанчын. Мужчыны, як правіла, выконваюць абавязкі, дзе патрабуецца сіла. Хоць у залежнасці ад абставін могуць справіцца з усім. Не сакрэт, што зарплаты ў нас невялікія. Але расклад па зменах дазваляе працаваць па сумяшчальніцтве. Для некаторых мужчын такая работа становіцца дадатковай. І ўсё ж важна разумець, што далёка не кожны здольны даглядаць чужых людзей. Многія нават са сваімі роднымі не могуць справіцца. Тут альбо ляжыць да гэтага душа, альбо не. Выпадковых людзей у гэтай прафесіі няма.

Ганна КУРАК, *Капыльскі раён.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»
31 октября 2019 года проводит
18-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
Вось людзі, на якіх абапіраецца сёння наша вытворчасць. Пералік, зразумела, не поўны. Але пакуль паставім на гэтым кропку. Лепш даказваць сваю прафесійную прыгоднасць не словам, а справай.

Пакуль асноўны транспарт углыб нетраў.

— Прабачце, на належную інжынерную падрыхтоўку вытворчасці павінен быць нацэлены ўвесь апарат кіравання трэста...

— У яго задача нават больш шырокая і адказная, ён павінен быць сапраўдным мазгавым цэнтрам. Так яно і ёсць на самай справе. А мазгавы цэнтр па азначэнні ўзначальвае генеральны дырэктар.

Як старшыня Савета дырэктараў магу сказаць вось аб чым. Дзяніс Аляксандравіч Дзіулін прыйшоў у калектыў простым рабочым, затым быў горным майстрам, начальнікам участка на будаўніцтве Чырвонаслабодскага рудніка. Чалавеку актыўнай жыццёвай пазіцыі, яму нецікава было таптацца на месцы ва ўласным развіцці. На пасадзе начальніка ўчастка ён актыўна ўдзельнічаў ва ўзвядзенні Чырвонаслабодскага, затым Бярозаўскага руднікоў, быў у ліку тых, хто пачынаў будаўніцтва Гарлыкскага ГУКа ў Туркменіі. Там ён вырас да намесніка генеральнага дырэктара па інвестыцыйных будоўлях. Папрацаваў два гады, і стала зразумела, што ён можа адказваць не толькі за нейкі адзін кірунак, але і за ўсё прадпрыемства. Савет дырэктараў і інстанцыі даверылі Дзянісу Аляксандравічу пасаду генеральнага дырэктара, і гэты давер ён апраўдвае. Правільна вядзе палітыку прадпрыемства на далейшае развіццё таварыства — як эканамічнае, так і сацыяльнае, без чаго нельга. І можам канстатаваць, што побач з умацаваннем эканомікі ў нас развіваецца і сацыяльная база калектыву, мацуюцца сацыяльныя адносіны.

Напрыклад, у Петрыкаве будуецца жыллё, і гэта для нас неабходна, бо калі заказчык даверыў займацца там развіццём горных работ, то трэба клапаціцца і пра людзей. Каб трымаць цэлае ўпраўленне, безумоўна трэба будаваць жыллё. Тады людзі змогуць паехаць і працаваць спакойна, не ведаць праблем з бытам.

У нас, я лічу, наогул вельмі добра развітая сацыяльная сфера, і калектыў умее не толькі працаваць, але і адпачываць. Праводзяцца творчыя вечары, вечары КВЗ. Каманда клуба вясёлых і знаходлівых нашага трэста заняла першае месца на раённым першынстве. Абысці «Беларускалій», вы разумееце, было няпроста. Мы ўдзельнічаем у песенных аглядах-конкурсах, і таксама займаем лідзіруючыя месцы ў рэгіёне. Наогул, удзельнічаем ва ўсіх мерапрыемствах. Каманда наша па пажарна-прыкладных відах спорту і санітарная дружына пасля перамогі ў раёне будуць прадстаўляць раён на першынстве вобласці.

І гордасцю калектыву з'яўляецца валейбольная каманда, якой сёлета споўнілася 20 гадоў. Яна — трохкратны чэмпіён Рэспублікі Беларусь, валодае кубкам і суперкубкам краіны, тры разы выйгравала срэбраныя медалі і чатыры разы — бронзу. Усё гэта — дасягненні калектыву, ад рабочага да генеральнага дырэктара.

Гутарыў
Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.
Здымкі ААТ
«Трэст Шахтаспецбуд».
УНП 600122529.

Генеральны дырэктар Дзяніс ДЗІУЛІН з пераможніцай конкурсу «Міс трэст» інжынерам-тэхнолагам Рэгінай КАЛАЦКАЙ.

Працоўнае братэрства.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 35 (477)

На сцэне

Увесь верасень — тэатр

ВОСЕНЬ ПРАПАНУЕ «СКАНЦЭНТРАВАЦЦА»

З пачаткам сезона ў культурным асяродку толькі і размоў што пра тэатр: адна за адной праходзяць прэм'еры, анансуюцца падзеі і запрашаюцца замежныя госці. У якасці даволі важкага дадатку да «шараговага» тэатральнага жыцця, наколькі яго можна назваць шараговым, учора ў Мінску з сюррэалістычнай оперы «Канцэнтрат. Адкрыццё» Юрыя Дзівакова пачаўся дзявяты форум «ТЭАРТ».

«Канцэнтрат» ёсць слоган сёлетняга выпуску. Гэтым разам штогадовы фестываль, які традыцыйна складаецца з праграм беларускіх і замежных пастановак, а таксама асобнай серыі сустрэч і майстар-класаў, падрыхтаваў для гледачоў спектаклі з Францыі, Германіі, Літвы, Грузіі і ўласна Беларусі. Першыя з іх паказваюцца ўжо сёння: да 8 кастрычніка форум запросіць на пятнаццаць пастановак і арганізуе пяць мерапрыемстваў у рамках «Школы ТЭАРТа».

Праграма «Belarus Open», якая штогадова адбірае найбольш цікавыя беларускія тэатральныя работы, аддала перавагу незалежным праектам. Госці пакажуць у Мінску «Адысею» на неіснуючай мове, харэаграфічны спектакль з Францыі, чатырохгадзінную «Плошчу герояў» Крысціяна Люпы і найлепшы спектакль 2010 года па версіі часопіса «Нью-Ёркер».

Паколькі пайшла такая тэма, на тэатры «канцэнтруемся» і мы: менавіта ён у гэты час становіцца галоўным культурным ньюсмейкерам. Усё толькі пачынаецца, з вешалкі.

Прэм'ера

ДАРАГІ «КНЯЗЬ ІГАР»

Мастацкая метамарфоза: трагічная фігура ператвараецца ў гераічную

ПРАВІЦЕЛЬ, які прайграў бітву... Застаўся без войска, апынуўся ў палоне і страціў гонар перад сваімі... Але глыбока смуткуе і думае, як выправіць памылку, што прывяла да паразы ад чужынцаў. Такі князь Ігар у оперы Аляксандра Барадзіна — асоба складаная, трагічная, якая, разумеючы сваё становішча, не хоча мірыцца з прадвызначанасцю. Такога князя Ігара ведаюць усе аматары оперы — да твора Аляксандра Барадзіна неаднойчы звяртаўся наш тэатр. Іншага героя імкнуліся паказаць у новай версіі. Прынамсі, яе рэжысёр Галіна Галкоўская напярэдадні тлумачыла сваю ідэю прачытання твора. Але пастановачныя намеры — адно, яны часам гучаць вельмі натхняльна і не заўсёды потым апраўдваюцца ў глядзельнай зале. Іншая справа — выніковы мастацкі прадукт, якім яго бачаць (і ўспрымаюць) гледачы.

Опера «Князь Ігар» адкрыла сезон у Нацыянальным акадэмічным тэатры Беларусі. Чарговая прэм'ера твора, які ў нас любяць, — у афішы тэатра з'явіўся яшчэ ў 1934 годзе, а ў пасляваенны час было здзейснена некалькі пастановак. Папярэдняя версія Юрыя Аляксандрава рабіла акцэнт на асобе самога князя. Новая пастаноўка ўяўляе сабой хутчэй эпічнае палатно, дзе ўсе героі становяцца галоўнымі (кожны па-свойму гне сваю лінію і вядзе сваю партыю, адпаведна, усе салісты могуць паказаць сябе, што і робяць). Але калі тэма асобы ў гісторыі заўсёды актуальная, то зварот да эпічнай ілюстрацыі сюжэта выклікае пытанні: наколькі гэта абгрунтавана сёння?

А гэтым разам нам прапанаваны менавіта такі варыянт «Князя Ігара»: пастаноўка оперы маштабная, зробленая з размахам, дорага... На гэта звяртаеш увагу ўжо з самага пачатку: гучыць музыка, і карцінкі на экране «ўводзяць» у кантэкст, так бы мовіць, задаюць тон. І пазначаюць ідэю: ёсць святая Русь, яна непахісная, як магутныя храмы з крыжамі на бліскучых залатых купалах. І менавіта гэты кантэкст (а не ўмовы існавання герояў і развіцця іх вобразаў) вызначылі настрой, з якім я потым глядзела ўсю пастаноўку, што звяртае да далёкай мінуўшчыны, згаданай у «Слове пра паход Ігаравы». Падзеі XII стагоддзя, жыхары Пуціўля супрацьстаяць полаўцам. Гісторыя, пераказаная ў летапісе. І ўвасобленая на сцэне — у падкрэслена гістарычным варыянце, які рэалізуецца праз мастацкі вобраз спектакля. Гэта зроблена не проста дорага, а нават з шыкам. Дэкарацыі і касцюмы оперы, дзе фігуруе рэальны гістарычны герой, павінны ж перадаваць дух эпохі... Напэўна, так задумваў народны мастак Расіі Вячаслаў Окунеў. Але гістарызм на сцэне адыгрывае сваю ролю тады, калі ёсць і падкрэсліваюцца нейкія пазачасавыя паралелі.

Але тут іх шукаць не варта, бо опера ставілася зусім не дзеля іх. Найперш дзеля музыкі — і тут адноўленая справядлівасць у дачыненні да аўтара Аляксандра Барадзіна. Вядома, што пасля яго смерці твор дапрацоўвалі-кампанавалі іншыя, у прыватнасці Рымскі-Корсакаў сёе-тое скасаваў. Працягваючы гэтую лінію, беларуская пастановачная група дазволіла сабе таксама папрацаваць з музычным матэрыялам: штосьці знойдзенае ў архівах дадалося, то-бок музычнага матэрыялу паболела, што асабліва вітаў дырыжор-пастаноўшчык Аляксандр Анісімаў. А нейкія часткі проста пераставілі — гэта яшчэ больш падкрэсліла эпічнасць спектакля, асабліва ў пачатку і фінале.

ПЫШНЫЯ, з размахам пададзеныя віды каменных будынкаў Пуціўля (назва горада гучыць у оперы) адразу ж прымушаюць успамінаць гісторыю. Багатая Візантыя, і хіба што такія буйныя гарады як Кіеў і Полацк маглі на той час пахваліцца шыкоўнымі мураванымі храмамі. На большасці тэрыторый старажытных славянскіх княстваў на той час дамінавала ўсё ж драўляная архітэктура, крохкая і ўразлівая. Невялічкі кавалак яе мы бачым у праекцыі, калі трэба паказаць, як гарыць-палае Русь — чаму яе ўласна і трэба абараняць, бо попел (калі гэта ён?) плыве па небе дзіўнымі шматкамі, засцілаючы святло ў кутку задніка. Ды калі бачыш, пад якой абаронай магутных мураваных сцен знаходзяцца прыгожыя, культурна і багата апранутыя людзі, то міжволі думаеш: а чаго ж ім баяцца нейкіх нецывілізаваных качэўнікаў?..

А калі бачыш стан полаўцаў, разумееш, чаму дрэнны знак спрацаваў. Лагер ворагаў, дзе трымаюць паланёнага князя, паказаны вельмі пераканаўча і каларытна. Хор і балет працуюць на відовішчнасць, ажыўляючы больш вядомыя шырокаму слухачу «палавецкія скокі». Гэта прыгожа і рамантычна (нават зразумела, чаму сын Ігара закахаўся ў Канчакоўну). І гістарычна — цяпер ужо з мастацкага пункту гледжання, таму што гэты фрагмент створаны паводле адноўленай харэаграфіі Міхаіла Фокіна (легендарны балетмайстар працаваў над ім больш за 100 гадоў таму, з таго часу мастацтва балета таксама моцна змянілася). Але калі грунтам для спектакля з'яўляецца гісторыя, то ў ёй бярэцца самае-самае, каб глядач мог сказаць: там ёсць усё!

Дык і сапраўды ж ёсць. Акцэнты зроблены не на адной лініі, а на ўсіх адразу, па максімуме. Часам да прапанаваных трактовак вобразаў нішто не падводзіць. Галоўны герой Ігар не падобны на ахвяру нават у палоне, калі спявае сваю шчымлівую арыю «О, дайце, дайце мне свабоду...» У выкананні Уладзіміра Пятрова ён выглядаў не столькі як чалавек, які ў нечым раскайваецца, а як той, хто засяроджана абдумвае далейшыя дзеянні (і рашэнне абавязкова павінна знайсціся!). Яраслаўна ў выкананні Ірыны Крыкуновай атрымалася рашучай жанчынай, якая трымае ўсё пад кантролем (і як тут паверыць словам пра сваю сястру князя Уладзіміра Галіцкага, чаму ён вырашыў, што яна — вось такая — так проста можа сысці ў манастыр, каб вызваліць яму пасаду?). Князь Галіцкі (Андрэй Сялюцін) па волі рэжысёра выглядае сапраўдным антыгероем, нават большым, чым палавецкі князь Канчак — той паважае Ігара, добра яго з сынам прымае. Ён падаецца чалавекам з прынцыпамі, вось толькі ўмовы ваеннага часу размежавалі герояў як ворагаў, а так жа можна паразумецца. І падставы ёсць для шлюбу дзяцей. І калі ўсё так прыгожа-добра і заманліва, як мы бачым, чаму ж рускі князь усё ж бяжыць з палону?

ЗГОДНА з сюжэтам мы ведаем, чаму. Згодна з гісторыяй — у яго напярадзе шмат паходаў. Аўтары пастаноўкі падкрэсліваюць далейшую місію князя: сабраць палкі і бараніць радзіму, тэрыторыя якой пазначана канкрэтнымі хрысціянскімі сімваламі, — гэты рэжысёрскі ход канчаткова ўзводзіць эпічнасць у абсалют. Менавіта тут мы бачым, як князь збірае дружыны на вайну з полаўцамі. Звяртаецца да ўсіх князёў, у тым ліку і таго, якога «баяцца яцвягі і літва»... Дапускаю, што шмат хто са слухачоў можа не ведаць, дзе жылі гэтыя плямёны і можа не суаднесці іх назвы з гісторыяй нашай краіны. Але калі суаднесці, асабліва ў фінале (!?), то застаецца пытанне: пра якую радзіму размова?.. І калі мы не сыходзім ад гістарызму да абстрагавання, калі не рушым у бок умоўнасцяў і нейкіх агульначалавечых акцэнтаў, то ўсё ўспрымаецца вельмі канкрэтна. Наўрад ці гэта ідзе на карысць менавіта гэтай оперы ў беларускім тэатры ў XX стагоддзі: у славянскім свеце адбыліся шмат якія працэсы. Шмат што змянілася, нават у назвах тэрыторый, шмат краін утварылася. Але для кожнай з іх была і застаецца актуальная тэма патрыятызму. А опера «Князь Ігар» таксама пра гэта. Не пра тое, як стаць пераможцам, а пра тое, што людзі (уладары) могуць памыляцца, і бываюць памылкі, якія абарочваюцца вялікімі стратамі, але яны патрабуюць глыбокага асэнсавання — дзеля таго, каб бяда не паўтаралася зноў. Насамрэч, гэтая опера ў наш час можа быць актуалізаваная праз шмат тэм, якія ў ёй пазначаны. А гісторыя дзеля гісторыі (нават багата ілюстраваная) падобная на падручнік, які можа ўдакладняцца. Мастацкі твор — гэта ўсё ж значна больш, чым ілюстрацыя пэўнага кавалка жыцця. Гэта размова пра самое жыццё, якое людзі будуюць цяпер. Прыгадваючы гісторыю.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Асоба

Аляксандр ЯНУШКЕВІЧ:

«Адзіны спосаб прабіць гледача — пагаварыць з ім без скачкоў і крыўляння»

Новы будынак для Брэсцкага тэатра лялек ужо гатовы, але сезон пачынаецца без удзелу Аляксандра Янушкевіча, які сышоў з пасады галоўнага рэжысёра і ўскалыхнуў гэтым тэатральнае асяроддзе. Запатрабаваны не толькі ў Беларусі, але і за мяжой, аўтар з'яўляецца адным з нашых галоўных рэжысёраў-лялечнікаў. Ён паспеў папрацаваць мастацкім кіраўніком Пермскага тэатра лялек, паставіў лаўрэата тэатральнай прэміі «Залатая маска» спектакль «Тоўсты сшытак», яго «Вартавыя Тадж-Махала» ледзь не аднагалосна названыя крытыкамі адной з найлепшых беларускіх тэатральных пастановак мінулага года. Размову з Аляксандрам мы пачалі з самага надзённага.

— Ведаю, што вы ўскладалі на новае месца пэўныя надзеі, і раптам з'яўляецца навіна, што вы сыходзіце са сваёй пасады. Што здарылася?

— У нейкі момант я адчуў, што перашкаджаю. Я не мог на нешта паўплываць, адпаведна і адказваць не за свае памылкі не хачу. Практычна ўсе нашы тэатры заточаны на тое, каб аказваць паслугі, — такое бытавое абслугоўванне насельніцтва. Чыноўнікі не разумеюць, што такое тэатр, — не разумеюць і ўсё. На гэта можна наракаць альбо гэтым абурацца, але яны шчыра не разумеюць: спорт, будаўніцтва, цяжкая прамысловасць зразумелыя, а функцыі і пасылы тэатра — не.

— То-бок, у тэатры былі ўстаноўкі на нейкі пэўны прадукт?

— Ну, мне зрабіць установку складана, іх не было. Мы выпускалі спектаклі, але вось адзін з іх — «Боскі адбітак» — паказалі пару разоў — і ўсё. Ён цудоўна згніе толькі таму, што не спадабаўся адной цётцы і яна сказала школьнікаў на яго не весці, а значыць, пазбавіла касы, бо замест рэкламы тэатра ў нас робяць падаўнейшаму: «Алё, Лідзія Вікенцьеўна, нам трэба дзве тысячы» — «Добра, арганізуем, значыць, 1-я школа, 15-я і 18-я — усе ідуць». Атрымліваецца, траціш энергію ў пустэчу — а навошта?

— А глядач, які сам прыходзіць у тэатр, не сфарміраваўся?

— Канешне, ён ёсць, але ўсё залежыць ад колькасці жыхароў горада і агульнага культурнага ўзроўню. Напрыклад, у Пермі за час «культурнай рэвалюцыі» развіўся цэлы культурны пласт, гатовы глядзець, напрыклад, Рабэра Лепажа. Нават калі ў нас сто сапраўдных дапытлівых гледачоў, што шукаюць дыялог, а не рэцэпт існавання, можна зрабіць так, каб заўтра іх стала крыху больш, а паслязаўтра яшчэ больш. Я ў гэтым сэнсе аптыміст, але тут выгадоўваецца нешта іншае, адпаведна, і развіцця ніякага.

— Прычыны, па якіх вы сышлі з тэатра, палягаюць менавіта ў Брэсцкім тэатры лялек альбо ў сістэме дзяржтэатраў увогуле?

— Канешне, у сістэме, Брэсцкі — толькі адно з яе ўвасабленняў з вар'яцкімі планамі па выездах спектакляў, калі пра якасць гаварыць ужо не даводзіцца. На базу тэатра на ўсходзе горада, дзе цякло са столі і быў сабачы холад, гледачы, зразумела, не ішлі, таму арганізоўвалася па тры выезды ў дзень у дзіцячыя садкі і школы, дзе ў крыку і гомане з адным галагенным ліхтарыкам паказваўся спектакль. Гэта вядомая гісторыя, але да мастацтва не мае ніякага дачынення. З адкрыццём новага будынка адным з маіх пажаданняў было скончыць выезды. Гледачы б прыйшлі паглядзець, што як, а тэатр іх бы ўжо не адпусціў — праз майстар-класы, зоны для творчасці, пазатэатральную дзейнасць. Увогуле тэатр павінен быць адкрытым з дзевяці раніцы да дзесяці вечара. У новым будынку можна стварыць цэлы культурны цэнтр, але план па спектаклях настолькі шырокі, што ездзіць прыйдзецца ўсё роўна і ў спектакляў будзе адпаведная якасць.

— Значыць, цяпер вы вольны мастак. Сфера тэатра ў Беларусі ўвогуле прыдатная да таго, каб існаваць у ёй у такой якасці?

— Не, у нас занадта маленькі рынак, але ў мяне графік ужо распісаны да сярэдзіны 2021-га праектамі ў Беларусі, Расіі, Украіне і Славеніі. Я, калі сышоў з тэатра, злавіў такі кайф ад таго, што трэба самому браць сябе ў рукі і арганізоўваць свой рабочы дзень, і ад таго, што, аказваецца, у нас ёсць лета.

— На досведзе работы ў Брэсце, скажыце, ці моцна цэнтралізаваная наша сфера культуры альбо іншыя апроч сталіцы вялікія гарады прэтэндуюць на званне культурных цэнтраў?

— Мне здаецца, калі ў горадзе ёсць асоба, як у Магілёве быў Саўлюс Варнас, у ім нешта адбываецца. Хоць тэатр у Беларусі так глыбока ўспрымаецца прыкладным відам дзейнасці, нават не мастацтвам, «вы клоўны, паяцы, дык забаўляйце нас», што асоба «вымываецца». Індустрыя дамаслага шоу-бізнесу настолькі актыўная, што не важна, хто робіць спектакль. Паставілі «Тэстастэрон»: галоўнае — назва, а хто за ёй — Васін ці Пупкін, справа апошняя. Самае цікавае ў тэатры сёння адбываецца на недзяржаўных пляцоўках, бо стаўленне да тэатральных дзеячаў накшталт «вось гэта нельга, тут вы не пройдзеце і тут мы вас не пусцім» выклікала рэакцыю «і не трэба, мы зробім самі». Спробы нешта атрымаць адваліліся, гэтае «і не трэба» мне здаецца галоўным заваяваннем апошняга часу. Паколькі «работадаўцы» іншага стылю кіравання не ведаюць, яны губляюцца і ўключаецца іншая гісторыя: «Вас няма, вас няма і вас няма, і грошы мы нікому не дамо», хоць грошы гэта нашы агульныя.

— Лялечны тэатр выдзяляецца з усяго беларускага тэатра — ён цэніцца за мяжой, мае цэлы шэраг заўважных рэжысёраў

і ў нашым культурным асяроддзі лічыцца перадавым. У чым яго феномен?

— Нават у іншых краінах мне задавалі такое пытанне. Напрыклад, Купалаўскі тэатр знаходзіцца пад пільнай увагай, туды ходзяць чыноўнікі і бізнес — нельга аблажацца. А ў лялечны ніхто не ходзіць, таму аблажацца можна. Мне здаецца, менш увагі, калі ты не знаходзішся пад прыцэлам, — гэта выратаванне. Лялечны, ну што гэта такое, сорамна каму сказаць, бо пачуеш: «Дзе ты працуеш? У Лялечным тэатры? Вы там у лялькі гуляеце?» Таму і з кадрамі вялікая праблема: па-першае, вельмі мала плацяць, а па-другое, вы ўяўляеце сабе? — стаіць дзядзька, 35 гадоў, з барадой, а ён «у лялькі гуляецца». Ды і як можна па-іншаму ставіцца, калі ты прыходзіш у тэатр, а там табе добра калі не голую дупу паказваюць. Наш заточаны на забаву тэатр вельмі хоча спадабацца, і рэакцыя «Вы што, клоўны?» натуральная. Як казаў адзін заслужаны артыст: «Так скакала, так скакала, ледзь з трусоў не выскачыла». Таму ў нашым XXI стагоддзі знішчаецца прафесія, хоць гэта не XIX, калі артыстак пасля спектакля вадзілі па нумарах.

— Аляксей Ляляўскі ў інтэрв'ю расказваў мне, як на адкрыцці аднаго з фестываляў тэатраў лялек у Мінску афіцыйная асоба сказала: «Вы робіце вельмі важную справу, бо працуеце для дзяцей». Што вы скажаце пра стэрэатып аб тым, што лялечны тэатр — дзіцячы?

— Пераадольваць яго вельмі цяжка, спачатку я парываўся — там правядзеш асветніцкую работу, і там, і там, а потым думаеш, а навошта. У спадчыну ад саўка мы атрымалі іерархію: оперны для партыйных кіраўнікоў, ТЮГ і лялькі для дзяцей, — усе забяспечаны культуркай. Сёння адбываецца змяшанне відаў, Купалаўскі можа рабіць дзіцячыя спектаклі, ТЮГ — дарослыя, лялечны — харэаграфічныя, але чыноўнікам гэтага не зразумець. Увогуле ўсе гэтыя назвы накшталт «акадэмічны тэатр драмы і паэзіі» сыдуць, яны ўжо мёртвыя, таму даказваць, што лялькі — для дарослых, мне здаецца, неразумна. Можна стварыць новы тэатр, абазваць яго «Унія» і раніцай рабіць у ім перформансы, потым ставіць музыку, вечарам — драму, тады размежаванне тэатраў сыдзе само сабой. Трэба шырэй на ўсё глядзець.

— У сучасным лялечным тэатры можа і лялек не быць альбо яны могуць іграць другарадную ролю — як можна апісаць яго сутнасць?

— Недзе для канцэпцыі патрэбны класічныя планшэтныя лялькі, і калі гэта важна для раскрыцця ідэі, то можна сказаць, што ў ляльках, але ў цэлым сутнасць у ажыўленні мёртвага, надаванні яму значэння жывога ці нават боскага. Тут заўсёды мяняецца стаўленне да фізічных рэчаў і матэрый. Вось камень і ён жывы — умоўнасць, якую мы бяром у двукоссі і прымаем за правілы гульні, дае дадатковыя сэнсы. Гэта яшчэ адны дзверы, у якія мы можам увайсці.

— Ці ёсць у беларускага лялечнага тэатра нешта адрознае ад замежнага?

— Гэта залежыць ад аўтара. Калі ўспомніць Ляляўскага і Казакова, іх работам уласцівыя нейкая брутальнасць, аголенасць і тое, што я называю беларускім адчаем. Іх тэатр не замыльвае вострыя тэмы з пасылам «вы толькі не падумайце, што мы гэта мелі на ўвазе», а плясь па мордзе — і гэта мастацтва. У нас ёсць праўда, прамое выказванне — мы будзем таптаць галаву лялькі нагамі, а не паказваць, што яна стаптаная. Мне здаецца, шмат значыць і наша нябоязь аблажацца, здольнасць ісці на рызыку і гатоўнасць быць незразуметым. Так, шмат пастановак заснаваныя на клішэ, якім вучылі ў інстытуце, і ўяўляюць з сябе, што самае дрэннае, кальку з драматычнага тэатра, калі ёсць лялька, у яе галава, рукі, ногі і ходзіць яна як акцёр. Тады навошта замяняць адно другім, дзе мастацкае рашэнне, што дае трэці сэнс? Хоць, канешне, тэатр не можа рабіць тры прэм'еры ў год і ў кожнай пераварочваць усё з галавы на ногі — прыйдзе адміністратар і скажа: «Нам трэба карміцца, дайце-ка нам «Тры парасяці». Бо глядач усё яшчэ чакае ад лялечнага таго, што бачыў у дзяцінстве, альбо таго, што бачыла яго бабуля, а калі чаканні не апраўдваюцца, у кнізе скаргаў з'яўляюцца абураныя запісы.

— Паміж нашымі рэжысёрамі лялечных тэатраў ёсць нейкая канкурэнцыя?

— Натуральна, а чаму не? Убачыш якое-небудзь класнае мастацкае рашэнне і думаеш: «Вось як крута, сабака, зрабіў», — але па-добраму, узнікае гонар, маўляў, «Нашы!».

— Спектакль «Вартавыя Тадж-Махала» быў пастаўлены не на звычайнай тэатральнай сцэне, а ў прасторы Ок16. Як такога кшталту месца ўплывае альбо абумоўлівае фармат спектакля?

— Там было цудоўна, артысты прыходзілі ў час, хацелі працаваць і, што важна, разам рагаталі, не было гэтага «зараз мы зробім акт мастацтва, давайце ўсе за рукі». Адказнасці свабодных людзей і іх зацікаўленасці дастаткова, што называецца, пакіньце людзей у спакоі — і яны самі ўсё зробяць. Увогуле «Арт Карпарэйшн» і Ок16 мяняюць нашае жыццё, там магчыма тое, што немагчыма на афіцыйнай сцэне. Гэта ніша для патрабавальных людзей, што разбіраюцца ў мастацтве. Некалі ў 1990-х у Гродне я хадзіў у кінаклуб «Ракурс» — паўсюль ішлі «Знесеныя ветрам» і французскія камедыі, а там круцілі арт-хаус. Для людзей ён быў дзвярыма, куды можна зайсці і глытнуць нешта іншае. Недзяржаўныя пляцоўкі ў Мінску — тая ж гісторыя.

— У наш час шоку ці можа такое высокае мастацтва, як тэатр, прабіць сучаснага гледача?

— Прабіванне залежыць ад досведу гледача: адзін успрыме бутафорскія кішкі як нешта страшнае, а іншы пасмяецца, што яго імі хочуць напалохаць. Мне здаецца, сёння ў тэатры важна не рабіць з гледача дэбіла, адзіны спосаб яго прабіць — нармальна пагаварыць, без скачкоў і крыўляння, на роўных, без чацвёртай сцяны, асабліва з дзецьмі. Калі што і спрацуе, дык гэта дыялог.

Гутарыла
Сафія ПАЛЯНСКАЯ.
Фота з асабістага архіва Аляксандра ЯНУШКЕВІЧА.

ГУЛЬНІ ДРОНАЎ

Як раскручваецца супрацьстаянне ў Персідскім заліве?

Роўна тыдзень таму адбылася атака дронаў на аб'екты нацыянальнай нафтавай кампаніі Saudi Aramco. Пацярпела інфраструктура ў раёнах радовішчаў «Абкайк» і «Хурайс», а таксама перапрацоўчыя магутнасці, якія знаходзяцца побач з імі на ўсходзе Саудаўскай Аравіі. Гэта прывяло да скарачэння ўзроўню здабычы «чорнага золата» ў найбуйнейшай арабскай манархіі амаль удвая. Атака парушыла і саудаўскі экспарт сыравіны. Адказнасць за напад узяў на сябе еменскі паўстанцкі рух «Ансар Ала» (хусіты). Пазней з'явілася інфармацыя, што НПЗ атакаваныя ўдарнымі беспілотнікамі разам з крылатымі ракетамі. У атацы падазраюць Іран, з-за чаго Эр-Рыяд і Тэгеран зноў на нажах. Чаму градус напружанасці ў стратэгічным рэгіёне Персідскага заліва зноў імкнецца да максімальнай адзнакі?

Дзве плыні

Саудаўская Аравія і Іран — два магутныя суседы — вядуць барацьбу за перавагу ў рэгіёне. Рэлігійныя супярэчнасці толькі абвастраюць іх супрацьстаянне, якому не адзін дзясятак гадоў. Краіны адданыя дзвюм розным плыням у ісламе — Іран пераважна складаецца з шыітаў, а Саудаўская Аравія лічыцца адным з лідараў суніцкага ісламу. Сутнасць рэлігійных рознагалоссяў становіцца зразумелая, калі зірнуць на карту Блізкага Усходу, дзе большасць насельніцтва — суніты або шыіты, адзначае Бі-бі-сі. Многія з іх лічаць Эр-Рыяд або Тэгеран сваім духоўным арыенцірам.

Саудаўская Аравія, на тэрыторыі якой зарадзіўся ісламскі гістарычна лічыла сябе лідарам ісламскага свету. Але ў 1979 годзе ў Іране адбылася ісламская рэвалюцыя, у выніку якой у рэгіёне з'явілася тэакратычная дзяржава, галоўнай мэтай якой стаў экспарт гэтай мадэлі ў іншыя краіны. Адносіны паміж Эр-Рыядам і Тэгеранам абвастрыліся асабліва моцна ў апошнія 15 гадоў. У 2003-м кааліцыя на чале з ЗША зрынула лідара Ірака Садама Хусейна — араба-суніта і аднаго з галоўных ворагаў Ірана. У выніку знікла значная процівага ўплыву Ірана, які з таго часу няўхільна расце. Шэраг «тэктанічных зрухаў» сярод галоўных гульцоў на Блізкім Усходзе адбыўся ў 2011 годзе, калі пракацілася хваля пратэстаў, якія атрымалі назву «арабская вясна» і сталі прычынай палітычнай нестабільнасці ў рэгіёне. Як адзначае Бі-бі-сі, Іран і Саудаўская Аравія скарысталіся гэтымі пратэстамі для прасоўвання свайго ўплыву, у прыватнасці, у Сірыі, Бахрэйне і Емене. Гэта яшчэ больш узмацніла ўзаемны недавер.

Апаненты Ірана сцвярджаюць, што Тэгеран імкнецца стаць вядучай сілай у рэгіёне, каб атрымаць кантроль над тэрыторыяй, што прасціраецца ад гэтай краіны да Міжземнага мора. Стратэгічнае процідорства ўзмацняецца, таму што ісламская рэспубліка па многіх паказчыках перамагае ў рэгіянальнай барацьбе. Саудаўцы адчайна спрабуюць стрымліваць гэты ўплыў. Ёсць і знешнія гульцы. Саудаўскай Аравіі надала ўпэўненасці падтрымка адміністрацыі Дональда Трампа, а Ізраіль, які лічыць Іран смяротнай пагрозай, падтрымлівае намаганні саудаўцаў.

Стратэгічная карта Блізкага Усходу дэманструе падзел сунітаў і шыітаў. Сярод саюзнікаў Саудаўскай Аравіі можна вылучыць суніцкія краіны — ААЭ, Кувейт, Бахрэйн, а таксама Егіпет і Іарданію. Поруч з Тэгеранам выступае ўрад Сірыі. Групоўкі шыітаў, якія падтрымлівае Іран, у тым ліку «Хэзбала», адыгралі значную ролю ў барацьбе з сіламі апазіцыі, пераважна сунітамі. Іракскі ўрад, які складаецца ў асноўным з шыітаў, таксама з'яўляецца блізкім саюзнікам Тэгерана. Пры гэтым, як ні парадаксальна, Багдад падтрымлівае цесныя сувязі з Вашынгтонам, які аказвае дапамогу гэтай краіне ў барацьбе з групоўкай «Ісламская дзяржава».

Без пасярэднікаў

Узаемаадносіны Тэгерана і Эр-Рыяда, як трапна адзначыла Бі-бі-сі, гэта ў пэўным сэнсе рэгіянальны эквівалент «халоднай вайны» паміж ЗША і СССР, якая доўжылася шмат гадоў. Іран і Саудаўская Аравія не вядуць баявых дзеянняў адзін з адным, але сілы, якія падтрымліваюцца імі, удзельнічаюць ва ўзброеных канфліктах у рэгіёне. Саудаўская Аравія абвінаваціла Іран у тым, што ён даў балістычныя ракеты групоўцы хусітаў у Емене. Тэгеран таксама абвінавачваюць у рэгулярнай дэманстрацыі сілы ў стратэгічна важных частках Персідскага заліва, цераз якія ходзяць судны з саудаўскай нафтай.

Да гэтага часу Эр-Рыяд і Тэгеран ваявалі рукамі пасярэднікаў. Ні адна з дзвюх дзяржаў не гатовая да прамога канфлікту. Аднак атака хусітаў, накіраваная на сталіцу, ці, як нядаўна, на буйны прамысловы аб'ект у Саудаўскай Аравіі, можа парушыць гэты баланс. Пасля хусіцкіх нападаў на інфраструктуру ў супрацьстаянні паміж Тэгеранам і Эр-Рыядам з'явілася новае вымярэнне. Як і ў выпадку з Персідскім залівам, дзе ў дзвюх краін марская мяжа, абвастрэнне напружання можа прывесці да значна больш шырокага і ўсёабдымнага канфлікту.

Для ЗША і краін Захаду свабодны рух у Персідскім заліве вельмі важны, таму любы канфлікт, які нясе пагрозу блакавання стратэгічнага для міжнароднага гандлю маршруту, верагодна, далучыць амерыканскіх вайскоўцаў. Штаты і іх саюзнікі даўно лічаць Іран дэстабілізуючай сілай на Блізкім Усходзе. Саудаўскія ўлады ўсё часцей бачаць яго як экзістэнцыяльную пагрозу, і, мяркуючы па ўсім, гатовыя зрабіць усё неабходнае, каб спыніць рост уплыву Тэгерана.

Дзе доказы?

Міністэрства абароны Саудаўскай Аравіі днямі прадэманстравала фрагменты беспілотнікаў і крылатых ракет, якія, па словах ваенных, паказваюць на датычнасць Ірана да нападу на два нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы. Усяго, па іх словах, было ўжыта 18 дронаў і сем крылатых ракет, запушчаных з боку, які выключае ўдзел у атацы Емена. Між тым менавіта еменскія паўстанцы, якія карыстаюцца падтрымкай Тэгерана, сцвярджаюць, што стаяць за гэтым нападам. Як вядома, хусіты — адны з самых актыўных карыстальнікаў беспілотнікаў, у прыватнасці апаратаў-«камікадзэ». Саудаўскія ўлады ўсё часцей бачаць яго як экзістэнцыяльную пагрозу, і, мяркуючы па ўсім, гатовыя зрабіць усё неабходнае, каб спыніць рост уплыву Тэгерана.

Абломкі сведчаць аб тым, што напад вёўся з поўначы, і «яго бясспрэчна арганізаваў Іран», — заявіў на прэс-канферэнцыі прадстаўнік міністэрства абароны Саудаўскай Аравіі, палкоўнік Туркі аль-Малкі. Таксама ён прадэманстраваў дэльтападобнае крыло іранскага беспілотніка. Гэтыя звесткі Эр-Рыяд таксама мае намер прадставіць у рамках Генасамблеі ААН на наступным тыдні.

Саветнік прэзідэнта Ірана Хесамедзін Ашэна заявіў, што ніякіх доказаў датычнасці Тэгерана да нападаў Саудаўская Аравія не дала. «Прэс-канферэнцыя даказала, што Саудаўская Аравія нічога не ведае аб тым, адкуль былі запушчаныя ракеты і беспілотнікі. Таксама яны не здолелі растлумачыць, чаму іх абарончыя сістэмы

не змаглі адбіць атаку», — напісаў Ашэна ў «Твітэры». Такой жа думкі прытрымліваюцца і іншыя эксперты. У прыватнасці, карэспандэнт Бі-бі-сі па бяспецы Джонатан Маркус заўважае, што ніякага цвёрдага доказу датычнасці Ірана да нападу пакуль прадстаўлена не было.

Кошт атакі

Між тым пасля атакі цэны на нафту перажылі рэкордны ў XXI стагоддзі аднаразовы рост — на таргах у пачатку гэтага тыдня яны павялічыліся на 19 працэнтаў. Атака на саудаўскія нафтаперапрацоўчыя магутнасці па сваім эфекце для нафтавага рынку перасягнула ўсе блізкаўсходнія ўзрушэнні мінулага, адным махам прыбраўшы з сусветнага рынку 5,7 млн бараляў у суткі. Для параўнання, пачатак ірана-іракскай вайны ў 1980 годзе прывёў да прыпынення магутнасцяў у 4,1 млн бараляў у дзень, уварванне іракскіх войскаў у Кувейт у 1990-м — 4,3 млн бараляў, а ісламская рэвалюцыя ў Іране — 5,6 млн бараляў.

Узлёт на нафтавым рынку быў такі значны, што па датычнай зачапіў і іншыя актывы. У прыватнасці, падаражэлі амерыканскія дзяржаўныя аблігацыі і золата, паведаміла iz.ru. У цане дадалі некаторыя валюты, у асноўным сыравінных дзяржаў — расійскі рубель, а таксама канадскі долар і нарвежская крона. Ф'ючарсы на бензін у ЗША падскочылі на 13 працэнтаў.

Праўда, пастаўкі нафты Саудаўскай Аравіяй вярнуліся ў норму літаральна праз некалькі дзён пасля нападаў, заявіў міністр энергетыкі каралеўства Абдул Азіз бін Салман, паведаміла Reuters. Вытворчыя магутнасці найбуйнейшай арабскай манархіі дасягнуць 11 млн бараляў у суткі да канца верасня і 12 млн бараляў — да канца лістапада, паведаміў кіраўнік саудаўскага Мінэнерга. Паводле яго слоў, у кастрычніку краіна вырабіць 9,89 млн бараляў у суткі.

Аднак не ўсё так проста. Наступства сітуацыі заключаецца яшчэ і ў тым, што атака моцна падарвала давер інвестараў да надзейнасці экспарту з Саудаўскай Аравіі. Па ацэнцы аналітыкаў галандскага банка ING, якіх цытуе The Financial Times, цяпер у цану на нафту могуць закладвацца рызыкі, звязаныя з перабоямі паставак з-за новага ўдару рознага кшталту дыверсантаў.

Дарэчы, як мяркуюць эксперты, сярод бенефіцыярыяў апынуліся і самі пацярпелыя. Падаражэнне бараля «ў выніку атакі дронаў выгаднае Саудаўскай Аравіі. Бюджэт манархіі церпіць страты з-за нізкай цаны на нафту», канстатаваў vz.ru вядучы эксперт Фонду нацыянальнай энергетычнай бяспекі Ігар Юшкоў. Як вядома, з сярэдзіны ліпеня сусветныя цэны на «чорнае золата» пачалі падаць з прычыны слабага попыту ў спалучэнні з высокімі аб'ёмамі здабычы нафты ў ЗША.

Ваенны сцэнарый

Цяпер існуе высокая рызыка разгортвання поўнамаштабнага ваеннага канфлікту ў Персідскім заліве. Наступствы будуць адчувальны і ў сусветным маштабе. Напрыклад, як адзначыў iz.ru генеральны дырэктар Фонду нацыянальнай энергетычнай бяспекі Канстанцін Сіманаў, іранцы пастаянна намякаюць: яны могуць заблакаваць стратэгічна важны Армузскі праліў. «Гэта катастрафічным чынам адаб'ецца на міжнароднай эканоміцы. Цераз праліў праходзіць да 20 працэнтаў сусветнага гандлю нафтай (40 % марскога гандлю). Свет зараз рыхтуецца да рэцэсіі, да гандлёвай вайны ЗША і Кітая. Калі ў гэты момант цэны на нафту зноў узляцяць да 150—200 доларaў за бараль, гэта знішчыць сусветную эканоміку. Высокія цэны на энергарэсурсы прывядуць да рэзкага скачка цэн на камунальныя паслугі ў Еўропе, гэта здольна прывесці да масавай адстаўкі ўрадаў. Свет можа кардынальна змяніцца», — адзначыў эксперт.

На думку спецыялістаў, ваенны сцэнарый можа прывесці да росту цэн на нафту да 80 доларaў за бараль. Злучаныя Штаты, у сваю чаргу, таксама зробяць больш жорсткімі санкцыі ў дачыненні да Тэгерана. Аднак, як адзначыў галоўны навуковы супрацоўнік Цэнтра арабскіх і ісламскіх даследаванняў Інстытута ўсходазнаўства РАН Уладзімір Ісаеў, ісламская рэспубліка жыве пад санкцыямі ўжо больш за 20 гадоў, таму рэспубліка вытрымае любы эканамічны ўдар з боку ЗША. Відавочна, што «гульні дронаў» у Персідскім заліве далёкія ад завяршэння.

Захар БУРАК.

ШЧАСЛІВЫ МАКІЯЖ АД ДАР'І ЙОДЗЕЛЬ

Візажыстка з Гродна — пра тытул чэмпіёнкі свету і сакрэты зорнай прафесіі

«Я залезла ў даўгі, каб паехаць у Аўстрыю на чэмпіянат свету па макіяжы», — прызнаецца Дар'я Йодзель. Адзіная беларуская візажыстка, якая заваявала прызнанне ў Еўропе і ЗША, жыве ў Гродне. І ў часы, калі сфера красы бачыцца лёгкім хлебам, Дар'я ператварае візаж у мастацтва. Гродзенка не ідзе па пратаптаных сцяжынках, а творчасцю кідае смелы выклік. Яна рэвалюцыянер у сваёй прафесіі, сама пракладвае шлях, якім ніхто не хадзіў, і вядзе многіх-многіх вучаніц.

Спецыяльна для «Звязды» Дар'я Йодзель расказала пра сваю работу на тыдні моды ў Нью-Ёрку, як паслугі фокусніка дапамаглі ёй здзівіць зорнае журы на чэмпіянаце свету, раскрыла сакрэты макіяжу, які за лічаныя хвіліны робіць любую жанчыну шчаслівай.

«World Bodypainting Festival» і тыдзень моды ў Нью-Ёрку

Штогод у ліпені аўстрыйскі гарадок Клагенфурт становіцца эпіцэнтрам модных падзей сусветнага маштабу. Пад «World Bodypainting Festival» аддаюць цэлы востраў. Гэта свята мастацтва бодзіарт, дзе і выбіраюць чэмпіёна свету ў макіяжы. Беларусы ніколі не падымаліся вышэй за трынаццатае месца — і тут з'явілася Дар'я Йодзель. Гродзенка заваявала гучны тытул з першай спробы.

«У фестывалі ўдзельнічалі 50 краін свету. У маёй намінацыі змагаліся 40 сапернікаў, — успамінае Дар'я. — Я люблю абсалютны палёт фантазіі, таму крэатыўны макіяж лічу роднай стыхіяй, дзе адчуваю сябе нібыта рыба ў вадзе. Мне блізкія фрыкавыя рэчы, тым не менш крэатыў павінен адбывацца ў межах строгіх законаў прапорцый, колеру. Люблю гэты кірунак макіяжу за мажлівасць сказаць сваё слова, праявіць сябе як мастак, а не проста добры візажыст. Так, я змагалася ў намінацыі макіяжу для рэкламных і модных праектаў. Ці замаўляюць кліенты такую паслугу для рэальнага жыцця? Канешне, не! Але элементы крэатыўнага макіяжу з подыума, як і вопратка з паказаў высокай моды, з часам выходзяць на вуліцы. Напрыклад, раней чырвоная памада ўдзень не гаварыла пра жанчыну нічога добрага, цяпер жа, наадварот, выдае густ, падкрэслівае стыль. І каляровыя бровы, вейкі, валасы ўжо не дзікунства».

Трэба сказаць, нават для рызыковай, смелай Дар'і стварэнне вобразу для чэмпіянату свету стала сапраўднай авантурай. І справа не ў тым, што заяўленая тэма «Дзівы эпохі нямога кіно» мела на ўвазе вобраз не для паходаў па хлеб. Гродзенка марыла выклікаць «ваў-эфект» у зорнага журы, дадаўшы ў крэатыўны макіяж сапраўдную магію.

«Я хацела закрыць вочы і вусны мадэлі дэкаратыўнымі лінзамі. Стварыць эфект драматычнай маскі. І каб падчас прэзентацыі вобраза элементы пачалі рухацца, лінзы расчыніліся і адкрыўся твар. У Маскве знайшла таленавітага фокусніка, здольнага сканструяваць адпаведны механізм, — дзеліцца гродзенка. — Самы просты элемент прыстасавання каштаваў бы тысячу долараў. Для мяне такая сума была гіганцкай. А яшчэ сукенка, перавоз мадэлі, яе падрыхтоўка, касметыка — каля пяці тысяч. Для дзяўчыны, якая не мае фінансавай падтрымкі звонку — гэта велізарная рызыка. А гарантый перамогі не было. Я ацаніла свае даўгі як зерне, без якога не будзе новай будучыні».

Дзякуючы тытулу чэмпіёнкі свету ў крэатыўным макіяжы, Дар'ю запрасілі ў каманду «INGLOT» на тыдні моды ў Нью-Ёрку. Але спыняцца на адным кірунку дзейнасці гродзенка не збіраецца. Разам з маладым брэндам Bernovich яна выпусціла аўтарскую палітру ценяў. На беларускім рынку дэкаратыўнай касметыкі такая калабарацыя стала першай.

Любоў і працоўны фанатызм

«Цяпер вы гаспадыня студыі макіяжу і крамы касметыкі. Назавіце канкрэтную суму, якую трэба мець на руках, каб навічку ўліцца ў сферу красы, пабудаваць бізнес?» — пытаюся ў дзяўчыны.

«Сума грашовых уліванняў залежыць выключна ад сегмента касметыкі, на якой вырашае працаваць майстар. А гэта ў сваю чаргу вызначаецца кліентам, — адказвае Дар'я Йодзель, пасля дадае: — Хочаш прэміум-сегмент — давядзецца адвучыцца на добрых курсах, купіць адпаведныя матэрыялы і, думаю, зразумела, што гэта дорага. Магу сказаць, што на сённяшні момант, прадаўшы касметыку, якая знаходзіцца ў нашай студыі, можна было б купіць кватэру і добрую норкавую шубу».

Захапляльны свет з вокладак модных часопісаў, які многім дзяўчатам бачыцца праз ружовыя акуляры... Але якія падводныя камяні на сваім шляху сустрэла Дар'я Йодзель?

«Элементарна стаяць па 10—12 гадзін на нагах, схіліўшы спіну, цяжка фізічна. Драконаўская канкурэнцыя і шалёны рытм, да якіх не кожны гатовы. Толькі пастаянныя майстар-класы, курсы, выезды на замежныя конкурсы, праекты дазваляюць трымаць сябе годна ў прафесіі візажыста. Матэрыялы патрабуюць закупкі з каласальнай хуткасцю. Каб увайсці ў сферу красы на топ-узроўні, прафесіянал павінен круціцца вакол восі без выхадных, пад ляжачы камень вада не бяжыць, — упэўнена Дар'я. — Якасны візаж не існуе і без эмацыянальных укладанняў. І на перспектыву развіцця гэтай прафесіі ў Беларусі магу сказаць, што не за гарамі час, калі галоўную ролю будуць адыгрываць менавіта рэкамендацыі ад візажыстаў з гучнымі імёнамі. У Еўропу і ЗША такая сістэма прыйшла даўно. У Гродне ж пакуль распаўсюджана самарэклама. Ты яшчэ нічога не дасягнуў, але нагаварыў, які ты класны, надзеў фальшывую карону, — табе паверылі».

Рэцэпт поспеху ад Дар'і Йодзель заключаецца ў безумоўнай любові да сваёй справы і фанатычнай працы. І аніякія фізічныя цяжкасці, канкурэнцыя, адсутнасць грошай не стануць на шляху ў чалавека, які цвёрда вырашыў дасягнуць найвышэйшага пілатажу ў прафесіі. Такіх людзей, смелых, ідэйных, перанасычаны рынак сферы красы, вядома, прыме.

Не толькі пэндзлі і фарбы

«Люблю працаваць з рознымі тыпажамі. Калі шукаю мадэль, цаню нестандартнасць, іскрынку. Тут амаль як у каханні, галоўнае «хімія», каб чалавек падабаўся, — усміхаецца дзяўчына. — Я люблю людзей, таму з усімі працую з задавальненнем. Жаночая краса — гармонія, а не ідэальныя невядома кім прыдуманыя крытэрыі. Так, макіяж можа кардынальна мяняць твар! Аднак я супраць таго, каб «забіваць» прыродныя даныя жанчыны. Толькі карэкцыя і падкрэсліванне. Макіяж не тэатральны грым. І сёння тэндэнцыі дыктуюць стаўку на натуральнасць. Таму галоўнае з увагай ставіцца да броваў і тону скуры. Першыя сёння ператварыліся ў супертрэнд, ледзь не ў самую важную частку аблічча. Астатняе мае факультатыўны характар».

«Я прапагандую той момант, што знешнасць у жыцці кожнай жанчыны ролю адыгрывае вялікую. У нас не будзе іншага шанцу зрабіць першае ўражанне. Тым больш ёсць моманты, дзе знешнасць можа дапамагчы дасягнуць мэты, — кажа Дар'я, маючы на ўвазе не толькі спатканні. — Здаецца, вы вопытны работнік, акула сваёй справы, але толькі вы зайшлі на рабочае сумоўе, пакуль і рота адкрыць не паспелі, а ўжо зрабілі 40 працэнтаў ад першага ўражання».

Туш, алоўкі, памада, румяны, модны сёння хайлайтар — гэта не проста жаночыя штучкі. У сітуацыі, калі на табе гара абавязкаў, няма вольнага часу, не ладзіцца асабістае жыццё і на рабоце цяжкасці, гэты банальны набор з касметычкі ператвараецца на адзіную зброю, здольную падтрымаць, стварыць добры настрой. Добры макіяж — самы лёгкі шлях да шчасця.

Калі гутарка заходзіць пра шчасце, Дар'я ажыўляецца. Жыццё часта ставіла для яе пытанне рубам. Чэмпіёнка заўжды выбірала прафесію як крыніцу сэнсу. Асабліва, калі ёсць мажлівасць дапамагаць, аддаваць.

«У Лондане праходзіць дабрачыннае шоу, куды з'язджаюцца выдатныя стылісты ад кожнага брэнда, — успамінае Дар'я. — Энергетыка мерапрыемства дорыць ні на што не падобныя адчуванні. Выручаныя сродкі ідуць у дзіцячы фонд па барацьбе з лейкеміяй. 250—300 тысяч фунтаў — грошы збіраюцца немаленькія. І калі ў канцы шоу выходзіць дзіця і выносіць імправізаваны чэк з гэтай сумай, вось тады разумееш, што жывеш не дарма, і што праца твая не проста пэндзлі і яркія фарбы».

Маргарыта САДОЎСКАЯ.

Яшчэ больш фота і відэа — на сайце www.zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении четвертого повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Слуцк-Модуль» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже:

Лот № 1: комплексимущества в составе:

№	Наименование	инв. №	общ. пл, кв. м
	Недвижимое имущество		
1	Здание инженерно-бытового корпуса, инв. № 98318, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84380	10378,5
2	Тепловые сети, инв. № 98342, расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84368	-
3	Площадка асфальтобетонная (инв. № 98364), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84443	1612,5
4	Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. № 98365), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84378	783,6
5	Трансформаторная подстанция, расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р -н, ул. 14 Партизан, 101/16	640/С-84444	37,7
6	Сети водопровода (инв. № 98340, инв. № 98339, инв. № 98341), расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84373	-
7	Канализационная насосная станция (инв. № 98330), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/24	640/С-84377	25,2
8	Эстакада-площадка для мойки автомобилей, расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84445	-
9	Топливно-заправочный пункт (инв. № 98327), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84371	-
10	Очистные сооружения дождевых стоков (инв. № 98331), расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84365	-
11	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25301), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84372	-
12	Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25300), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84367	-
13	Контрольно-пропускной пункт, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/4	640/С-84440	8,1
14	Склад газовых баллонов, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/10	640/С-84442	107,8
15	Вспомогательный корпус часть, инв. № 98358, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/12	640/С-84381	1353,6
16	Объекты благоустройства, расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84370	-
17	Главный корпус инв. № 98319, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/23	640/С-84382	22590,0
18	Здание вспомогательного корпуса инв. № 98360, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/13	640/С-51701	335,7
19	Склад тяжелых металлов, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/22	640/С-39784	634,6
20	Здание склада, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/8	640/С-38241	535,9
21	Производственное здание-котельная инв. № 98361, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/21	640/С-51700	194,3
22	Гараж со вспомогательным корпусом, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/3	640/С-47756	1362,3
23	Здание склада, расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/18	640/С-38242	2467,1
24	Здание информационно-вычислительного центра расположенное по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/1	640/С-38243	2393,6
25	Автомонтажный корпус, расположенный по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/19	640/С-39783	8785,1
26	Дренажная насосная станция (инв. № 98329), расположенная по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101/7	640/С-84375	330,6
27	Сети канализации (инв. № 98626), расположенные по адресу: Минская область, Слуцкий р-н, ул. 14 Партизан, 101	640/С-84379	-
	Оборудование		
28	Кран мостовой электрический 16-5К-16,5-12УЗ, заводской № 147, инв. № по бух. учету 97097		
29	Кран мостовой электрический, заводской № 863, инв. № по бух. учету 98366		

Указанные объекты расположены на земельном участке, площадью **8,4478 га** с кадастровым номером 624650100001006603 (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га.

Часть объектов недвижимости сдается в аренду.

Начальная цена с НДС (20 %) **— 3 510 000,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены — **351 000,00 бел. руб.**). **Стоимость снижена на 45 %.**

Лот № 2: комплекс оборудования в составе:

1	Трансформатор ТМЗ-1000/10-84У1, заводской №250542, инв. № по бух. учету 8873
2	Трансформатор ТМЗ-630/10-82У1, заводской №341321, инв. № по бух. учету 8874
3	Трансформатор ТМЗ-630/10-82У1, заводской №351297, инв. № по бух. учету 8516
4	Трансформаторная подстанция КТП-1 (2КТП-630-10-81УЗ), инв. № по бух. учету 8868
5	Трансформаторная подстанция КТП-1 (2КТП-630-10-81УЗ), инв. № по бух. учету 8869

Объекты расположены по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 9 108,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **910 000,00 бел. руб.**).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Шаг аукциона — 5 процентов.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

